

ВАЕННЫЯ КІНОЛАГІ І ІХ ГАДАВАНЦЫ 4

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА КЛЯШЧОЎ? 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ЛІПЕНЯ 2023 г. СЕРАДА № 127 (30007)

## КОРАТКА

- **Больш за 607 тысяч замежнікаў наведалі Беларусь з пачатку дзеяння бязвізавага рэжыму.**
- Беларускія цяжкаатлеты заваявалі чатыры ўзнагароды гульняў «Дзеці Прымор'я», у баксёраў — два медалі.
- **У Беларусі пачалася ўборка азімых збожжавых.**
- Шэсць лясных пажараў патушаны ў Беларусі за суткі.
- **Фестываль «Джаз у горадзе N» пройдзе 7—8 ліпеня ў Нясвіжы.**



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар СТАРАВОЙТАЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«У Працоўным кодэксе з'яўляецца новы артыкул, які гаворыць аб вызваленні ад працы пры дыспансерызацыі. Як работнік будзе вызваляцца ад працы? Усё залежыць ад яго ўзросту. Чым работнік старэйшы, тым рызыка захворванняў вышэйшая, таму людзі, якім да 40 гадоў, будуць вызваляцца ад працы раз на тры гады на адзін дзень з захаваннем сярэдняга заробку. Работнікам, якім больш за 40 гадоў, але якія не дасягнулі пенсіённага ўзросту, будзе штогод давацца адзін дзень з захаваннем сярэдняга заробку. Работнікі-пенсіянеры будуць атрымліваць два дні штогод».*

З першых вуснаў

# «БЕЛАРУСЬ АКТЫЎНА ПРАСОЎВАЕ ІДЭЮ ГЛАБАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ»

### Аб чым гаварыў Прэзідэнт на анлайн-пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС

**Падчас урачыстасцяў Дня Незалежнасці часта падкрэслівалася, што Беларусь — мірная краіна, настроеная на дыялог з суседзямі і партнёрамі. Як прыклад — актыўны ўдзел Беларусі ў міжнародных інтэграцыйных структурах, у тым ліку і ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Адразу пасля Дня Незалежнасці Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Сустрэча прайшла ў фармаце відэаканферэнцыі.**



Фота БелТА.

Вітаючы ўдзельнікаў пасяджэння, Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванне, што наступнае пасяджэнне пройдзе ў вочным фармаце. «Перакананы, з прыходам у ШАС такой магутнай дзяржавы з найбагацейшай гісторыяй і культурай, як Ісламская Рэспубліка Іран, і новых партнёраў па дыялогу — Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Кувейта, М'янмы і Мальдыўскай Рэспублікі — мы станем яшчэ больш згуртаванымі і эфектыўнымі. Упэўнены, пры падтрымцы ўсіх краін-членаў Беларусь у найбліжэйшы час таксама далучыцца ў якасці паўнапраўнага ўдзельніка да Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Мы адпаведную работу правялі. Мы ўдзячныя тым, хто нас у гэтым падтрымлівае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Тэму саміта «На шляху да бяспечнай ШАС» беларускі лідар назваў вельмі актуальнай ва ўмовах паглыблення крызісу міжнародных адносін. Па словах Прэзідэнта, ранейшая сістэма бяспекі не была ідэальнай, але, тым не менш, прадугледжвала механізмы стрымлівання і процівагі, абавязковасць выканання нормаў міжнароднага права. «Сёння мы бачым поўны злом усіх правіл і паняццяў. Таму нядзіўна, што Шанхайская арганізацыя змушаная яшчэ больш факусіравацца не на пытаннях эканомікі, а на праблемах бяспекі і стабільнасці ў рэгіёне. Цвёрда адстойваючы прынцыпы міру для ўсіх без выключэння дзяржаў, Мінск на розных міжнародных пляцоўках пастаянна праводзіць работу па пошуку кампрамісных рашэнняў і развязак», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

**Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні закрануў шэраг напрамкаў узаемадзеяння ў рамках Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.**

**ПЕРШЫ.** «Усё больш надзённымі з'яўляюцца для краін-удзельніц арганізацыі такія выклікі і пагрозы, як дэструктыўныя кібератакі, крадзеж лічбавых даных, мэтанакіраванае распаўсюджванне фэйкаў у інфармацыйнай прасторы», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, беларускі бок гатовы да супрацоўніцтва ў супрацьстаянні гэтым выклікам, уключаючы навучанне спецыялістаў, рэалізацыю сумесных праектаў па кібервучэннях, узаемны абмен тэхнічнымі рашэннямі.

**ДРУГІ.** «Захад, чапляючыся за дамінаванне, якое губляе, у шэрагу сфер эканомікі і фінансаў спрабуе стрымаць развіццё непажаданых яму краін і ўводзіць супраць іх незаконныя варварскія санкцыі. Каб гэтаму эфектыўна супрацьстаяць, Беларусь актыўна прасоўвае ідэю глабальнага развіцця. Паслядоўна выступаем як за стварэнне вялікага Еўразійскага партнёрства з краінамі, з якімі ў нас ужо склаліся цесныя адносіны, — Кітаем, Індыяй, Пакістанам, Іранам, нашымі партнёрамі па СНД, так і за спалучэнне фарматаў ЕАЭС, ШАС і БРІКС у шырокім кантэксце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Спецыяльны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ!

# З вадой не жартуюць

### Прытрымлівайцеся правіл бяспекі пры купанні і сачыце за дзецьмі

**Кожны купальны сезон сумная статыстыка ахвяр вады, на жаль, папаўняецца. Не стала выключэннем і гэтае лета. У перыяд з 1 чэрвеня да раніцы 4 ліпеня ў вадаёмах краіны патанулі 57 чалавек, сярод іх — шасцёра дзяцей...**



Фота з сайта МНС.

### ДЗЕ БЫЛІ ДАРОСЛЫЯ?

Адзін з трагічных выпадкаў здарыўся ў Магілёве. У рацэ Днепр патануў хлопчык 2014 года нараджэння. Як потым высветлілася, кампанія дзяцей, сярод якіх былі два браты, купалася ў заліве і каталася на імправізаваным драўляным плыце. Дарослых побач з дзецьмі не было. Калі малодшы з братоў упаў з плыта ў ваду і пачаў тануць, старэйшы, не здолеўшы аказаць яму дапамогу, выйшаў на бераг і набраў нумар ратавальнікаў. Астатнія дзеці, якія купаліся з імі, уцяклі. Вадалазы пажарнага аварыйна-ратавальнага атрада Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС выцягнулі пацярпелага хлопчыка з вады і перадалі ўрачам хуткай медыцынскай дапамогі. Школьніка шпіталізавалі ў абласную дзіцячую бальніцу, дзе ўрачы некалькі гадзін змагаліся за яго жыццё. На жаль, выратаваць дзіця не ўдалося.

СТАР. 3

На слыху

# АД ПЛОШЧЫ БАНГАЛОР ДА СВІСЛАЧЫ

### Што новага на Зеленалужскай лініі

**Ці перакрыюць рух на плошчы Бангалор? Ці атрымаецца правесці «зялёную» лінію метро пад Свіслачу? Калі жыхары комплексу «Мінск-Свет» і іншых густанаселеных раёнаў змогуць спусціцца пад зямлю? Мы пагаварылі з прадстаўнікамі «Мінскметрабуда» і даведаліся: што і на якім этапе ў будаўніцтве трэцяй лініі метро.**

СТАР. 13



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ISSN 1990 — 763X

23127

9 771990 763008

# «БЕЛАРУСЬ АКТЫЎНА ПРАСОЎВАЕ ІДЭЮ ГЛАБАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**ТРЭЦІ.** «Важны складнік пастаяннага тэхналагічнага развіцця — гэта абмен вопытам і назапашанымі ведамі», — падкрэсліў Прэзідэнт. У якасці аднаго з магчымых пілотных праектаў на платформе ШАС ён прапанаваў падрыхтаваць праграму аб'яднання інфармацыйных рэсурсаў цэнтраў трансферу тэхналогій. «Так мы зможам стымуляваць працэсы прасоўвання і камерцыялізацыі навукова-тэхнічных праектаў», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

**ЧАЦВЁРТЫ.** «Ва ўмовах абвастрэння праблем глабальнай харчовай бяспекі дзяржавы ШАС могуць разлічваць на магчымасці Беларусі як аднаго з найбуйнейшых экспарцёраў угнаенняў, сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання», — запэўніў беларускі лідар. Ён адзначыў, што для фінансавага суправаджэння гандлёвых кантрактаў і рэалізацыі розных праектаў Рэспубліка Беларусь цалкам падтрымлівае ідэю вяртання да прапрацоўкі ініцыятывы стварэння Банка развіцця ШАС.

**ПЯТЫ.** «Мінск захоўвае зацікаўленасць у трансфармацыі агульнай транспартна-лагістычнай прасторы ШАС, у тым ліку шляхам актывізацыі міжнародных перавозак, паскарэння і лічбавізацыі працэдур кантролю, добраўпарадкавання і эксплуатацыі транспартнага калідора «Поўнач — Поўдзень», — заявіў Прэзідэнт.

**ШОСТЫ.** Для больш блізкага знаёмства з разнастайнасцю культур арганізацыі беларускі бок прапаноўвае разгледзець магчымасці рэалізацыі маштабнага сумеснага праекта — Фестывалю культур ШАС, зрабіўшы яго традыцыйным.

**СЁМЫ.** «Усе нашы планы рызыкуюць застацца на паперы, калі не ўзмоцнім работу з падрастаючым пакаленнем. Многае з таго, што мы цяпер абмяркоўваем, будуць рэалізоўваць сённяшнія студэнты. Трэба падумаць над стварэннем платформы ШАС для моладзі», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка.

Завяршаючы сваё выступленне, беларускі лідар павіншаваў Астану з прыняццем старшынства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Не сумняваюся, што пад старшынствам Казахстана ШАС атрымае новы імпульс у сваім развіцці», — заявіў ён.



## ❍ У тэму

### ШАС становіцца арганізацыяй, якая ідзе ў будучыню

Падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва **прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра МОДЗІ** прывітаў падпісанне Беларуссю мемарандума па ўступленні ў ШАС. Індыя сёння займае пасаду старшыні ў арганізацыі, а Беларусь мае намер стаць паўнапраўным членам ШАС у максімальна магчымыя сціслыя тэрміны. Нарэндра Модзі звярнуў увагу на важнасць таго, каб ШАС змагла адказаць на розныя выклікі сучаснасці, апраўдаўшы чаканні народаў краін, якія ўваходзяць у арганізацыю. «ШАС становіцца арганізацыяй, якая поўнасцю падыходзіць для таго, каб існаваць у будучыню», — упэўнены ён. Прэм'ер-міністр Індыі падкрэсліў, што ШАС можа стаць важным голасам у справе рэфармавання іншых глабальных інстытутаў, у тым ліку ААН.

Старшынства ў ШАС ад Індыі пераймае Казахстан. **Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт ТАКАЕЎ** заявіў, што настаў час для прыняцця новай стратэгіі ШАС. Казахстан распрацаваў праект дакумента і плане прадставіць яго ў рамках свайго старшынства. Касым-Жамарт Такаеў падкрэсліў важнасць дыстанцыравацца ад праблем двухбаковага характару, бо ШАС павінна асацыіравацца з узаемаразуменнем і супрацоўніцтвам. Прэзідэнт Казахстана прадставіў прыярытэты, якія будуць мець стратэгічнае значэнне для далейшага развіцця ШАС. Сярод іх — забеспячэнне бяспекі і стабільнасці на прасторы арганізацыі, пашырэнне гандлёва-эканамічных сувязяў, развіццё транзітна-транспартнага патэнцыялу і супрацоўніцтва ў лагістыцы, умацаванне энергетычнага супрацоўніцтва, пашырэнне ўзаемадзеяння ў лічбавай сферы, умацаванне ўзаемадзеяння ў пытаннях экалогіі, развіццё культурна-гуманітарных сувязяў, турызму.

**Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі ЦЗІНЬПІН** перакананы, што краіны ШАС павінны агульнымі намаганнямі выступаць стабілізацыйным і канструктыўным фактарам для міру і развіцця на планеце. «Трэба захоўваць пільнасць да спроб звонку распальваць новую халодную вайну і правакаваць блокавую канфрантацыю ў нашым рэгіёне, катэгарычна выступаць супраць любых спроб умяшання звонку і інспіравання «каляровых рэвалюцый» пад якой бы там ні было падставай, моцна трымаць у сваіх руках лёс уласнага развіцця і росквіту», — сказаў кітайскі лідар.

Сі Цзіньпін лічыць мэтазгодным павялічыць долю разлікаў у нацыянальных валютах у рамках арганізацыі, нарошчваць супрацоўніцтва па суверэннай лічбавай валюце, працаваць над стварэннем Банка развіцця ШАС. Акрамя таго, Кітай прапанаваў працягваць паглыбленне супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, навукі, культуры, спорту і СМІ.

**Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір ПУЦІН** адзначыў, што Расія выступае за больш хуткае завяршэнне працэсу ўступлення ў ШАС Рэспублікі Беларусь. «Перакананы, што членства Беларусі, якая з'яўляецца стратэгічным партнёрам і найбліжэйшым саюзнікам Расіі, пазітыўна адаб'ецца на дзейнасці арганізацыі», — сказаў ён. Уладзімір Пуцін таксама адзначыў неабходнасць уважлівага і канструктыўнага разгляду ўсяго самавітага партфеля заявак і ад іншых дзяржаў, якія жадаюць у той ці іншай якасці супрацоўнічаць з ШАС.

## Даведка

Наша краіна ўдзельнічае ў ШАС з 2010 года ў статусе партнёра па дыялогу і з 2015 года — у статусе назіральніка. У 2022 годзе было падпісана Рашэнне аб пачатку працэдуры ўступлення ў члены арганізацыі. Беларусь разглядае Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва ў якасці міжнароднай пляцоўкі для вызначэння канкрэтных механізмаў развіцця супрацоўніцтва ў сферы супрацьдзеяння пагрозам тэрарызму, экстрэмізму, арганізаванай злачыннасці і наркатрафіку, выступае за ўмацаванне эканамічнага вымярэння ШАС у якасці найважнейшага фактару стабільнасці ў еўразійскім рэгіёне.

Беларусь прымае актыўны ўдзел ва ўсіх асноўных вымярэннях дзейнасці арганізацыі: палітыка-дыпламатычным, гандлёва-эканамічным і культурна-гуманітарным, а таксама ў ваенным супрацоўніцтве, у тым ліку ў тактычных вучэннях. У 2022 годзе на долю дзяржаў ШАС прыпадала 69,9 працэнта ўсяго тавараабароту Рэспублікі Беларусь. У сферы эканомікі Беларусь зацікаўлена ў развіцці транспартнай прасторы ШАС, міжнародных аўтамабільных перавозак, а таксама ў скаардынаваным развіцці аўтамабільных дарог, чыгуначных перавозак, што будзе садзейнічаць удзелу ў мультымадальных перавозках, фарміраванню спрыяльнай сеткі транспартнай інфраструктуры і раскрыцці транзітнага патэнцыялу.

Падчас мерапрыемстваў ШАС Рэспубліка Беларусь вылучыла шэраг ініцыятыў, накіраваных на развіццё арганізацыі. У прыватнасці, па забеспячэнні харчовай бяспекі ў рамках ШАС, стварэнні спецыялізаванай экспазіцыі «АграШАС» на міжнародным форуме аграрыяў «Белагра», развіцці «IT-экасістэмы ШАС», умацаванні ядзернай бяспекі і мірнага выкарыстання атама, супрацоўніцтве транспартных перавозак, барацьбе з кіберпагрозамі і інш.

### Падпісаны мемарандум аб абавязацельствах Беларусі ў працэсе далучэння да ШАС

Вынікі саміту ў размове з журналістамі падвёў **міністр замежных спраў Сяргей АЛЕЙНІК**. Самы галоўны вынік пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС — падпісанне мемарандума аб абавязацельствах Рэспублікі Беларусь у працэсе далучэння да арганізацыі ў якасці паўнапраўнай дзяржавы-члена. Гэты мемарандум падпісаны ўсімі без выключэння краінамі, генеральным сакратаром арганізацыі. «Далейшы працэс будзе звязаны з ратыфікацыяй гэтага мемарандума і ўсяго пакета нашых абавязацельстваў усімі краінамі-членамі. Як толькі працэс ратыфікацыі ўсімі краінамі будзе завершаны, можна будзе гаварыць аб паўнапраўным уступленні Беларусі ў ШАС. Разлічваем, што гэта адбудзецца ў найбліжэйшай перспектыве. З нашага боку ўся неабходная заканадаўчая работа праведзена. Размова ідзе аб аднамомантнай ратыфікацыі мемарандума і 47 пагадненняў, падпісаных у рамках ШАС дзяржавамі-членамі, да якіх Беларусь далучаецца ў рамках гэтага працэсу», — расказаў Сяргей Алейнік.

Па яго словах, саміт пацвердзіў, што ўсе лідары салідарныя ў сваіх ацэнках змяненняў, якія адбываюцца ў свеце, і ў імкненні пабудовы больш справядлівага светапарадку, заснaванага на міжнародным праве, на павазе і роўнасці дзяржаў, на павазе базавых прынцыпаў са Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. «І, канешне ж, сённяшні саміт пацвердзіў нацэленасць усіх лідараў да большай згуртаванасці, да большай салідарнасці, да павагі нацыянальных інтарэсаў краін — удзельніц арганізацыі і далейшага паступальнага ўстойлівага развіцця ўсіх краін — членаў арганізацыі», — падкрэсліў міністр замежных спраў.

Беларускі бок разглядае ШАС не толькі як дыялогавую пляцоўку, але і як арганізацыю, што прадугледжвае пэўныя практычныя кірункі супрацоўніцтва. «Безумоўна, на першым плане знаходзяцца пытанні бяспекі. Вялікая ўвага была ўдзелена развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, нарошчванню гандлёвага патэнцыялу арганізацыі, зняцця бар'ераў у гандлі, паляпшэнню і ўдасканаленню гандлёвых ланцужкоў, плюс да гэтага вялікая ўвага аддавалася і транспартна-лагістычнаму складніку. Актыўна гучала тэматыка разлікаў у нацыянальных валютах, і гэтай тэме будзе ўдзяляцца пільная практычная ўвага. На парадку дня ў арганізацыі — вельмі шмат пытанняў эканамічнага характару, — сказаў Сяргей Алейнік. — Для нас, для Беларусі, узаемадзеянне з гэтай арганізацыяй і ўзаемадзеянне з усімі без выключэння членамі мае вельмі важнае практычнае і эканaмічнае значэнне».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Страты ад беспарадкаў у Францыі перавысілі мільярд еўра

У Саюзе прадпрымальнікаў Францыі (MEDEF) падлічылі, што некалькі дзён беспарадкаў прынеслі страты французскім прадпрымальнікам і банкірам у больш за 1 млрд еўра. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на газету Le Parisien. Кіраўнік MEDEF Жофруа Ру дэ Безье адзначыў, што пакуль яшчэ рана казаць аб дакладнай суме, але адназначна гаворка ідзе пра больш чым мільярд еўра. І гэта без уліку страт, якія панесла сфера турызму. Відэа і фота пагромаў, што абляцелі ўвесь свет, наносяць шкоду іміджу Францыі. Гэтыя падзеі паўплываюць на выбар турыстаў гэтым летам: знізіцца колькасць браніраванняў гатэляў у Францыі. Кіраўнік офіса Парыжа па турызме Жан-Франсуа Рыяль распавёў Agence France-Presse, што замежныя турысты, асабліва з ЗША, адмянілі да 25 працэнтаў браніраванняў у парыжскіх гатэлях на фоне беспарадкаў. І гэта пры тым, што французская сталіца яшчэ да канца не акрыяла ад рэпутацыйных страт пасля нядаўняй забастоўкі зборшчыкаў смецця. Пры гэтым прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон заявіў, што пакуль заўчасна казаць аб памяншэнні беспарадкаў, якія ахапілі краіну.

### Судан працягнуў закрыццё паветранай прасторы краіны да 10 ліпеня

Упраўленне грамадзянскай авіяцыі Судана прыняло рашэнне прадоўжыць абмежаванні на палёты ў паветранай прасторы краіны. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал Al Jazeera. Паводле яго звестак, закрыццё паветранай прасторы працягваецца да 10 ліпеня. Выключэнне будзе зроблена для рэйсаў, якія выконваюцца ў гуманітарных мэтах. Абмежаванні на палёты былі ўведзены 22 красавіка ў сувязі з сітуацыяй у рэспубліцы і з таго часу неаднаразова працягваліся. Сітуацыя ў Судане абвастрылася з-за рознагалоссяў паміж камандуючым арміяй Абдэль Фатахам аль-Бурханам, які таксама кіруе Суверэнным саветам, і кіраўніком сіл хуткага рэагавання Мухамедам Хамданам Дагала. Паводле апошніх звестак Міністэрства аховы здароўя Судана, з пачатку баёў загінулі звыш трох тысяч чалавек, не менш чым шэсць тысяч атрымалі раненні.

### Найстарэйшая газета ў свеце выпусціла апошні штодзённы нумар




Аўстрыйская газета Wiener Zeitung, якая на працягу трох з лішнім стагоддзяў выходзіла на паперы кожны дзень, спыніла гэтую практыку. Цяпер штодня будзе выпускацца толькі лічбавая версія, а друкаванымі плануецца пакінуць штомесячныя дайджэсты. Газета ўпершыню пабачыла свет 8 жніўня 1703 года ў Свяшчэннай Рымскай Імперыі, тады яна называлася Wiennerisches Diarium. На працягу ўсяго часу свайго існавання яна была паважаным выданнем, якое асвятляла падзеі ўнутры краіны і за мяжой, культуру і бізнес. У газеце быў надрукаваны тэкст Дэкларацыі правоў чалавека, а Моцарт і Бетховен давалі ў ёй аб'явы. З-за спынення выпуску друкаваных штодзённых нумароў Wiener Zeitung вымушана скарацiць штат рэдакцыі амаль на дзве трэці — з 83 да 20 чалавек. Прычынай закрыцця друкаванага штодзённіка стала рэзкае падзенне даходаў.

# З вадой не жартуюць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Днямі раней трагедыя адбылася і ў Гомельскай вобласці. Дзяўчынка 2008 года знаходзілася на адпачынку з маці на беразе ракі. Раніцай 18 чэрвеня ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што дзіця прапала. Першапачатковыя пошукі не прынеслі выніку. Цела дзяўчынкі было знойдзена мясцовымі жыхарамі ў рацэ толькі праз некалькі дзён пасля трагедыі.

Патанулага падлетка вадалазы шукалі і ў кар'еры ў Полацку. Як удалося высветліць, у адзін з чэрвеньскіх вечароў двое непаўналетніх накіраваліся да кар'ера для адпачынку. Пасля распіцця спіртных напояў адзін з іх вырашыў пакупацца. Пасля таго, як хлопец знік з поля зроку свайго сябра, той кінуўся яго шукаць. Пасля няўдалых пошукаў падлетак звярнуўся ў МНС. Ратавальнікі выявілі цела хлопца 2006 года нараджэння на адлегласці сямі метраў ад берага, на глыбіні 2,5 метра. Месца, у якім купаўся загінулы, не абсталявана для адпачынку.

Выязджалі ратавальнікі і на паведамленне аб патанулым хлопчыку ў рацэ Прыпяць у Мазырскім раёне Гомельскай вобласці. Супрацоўнікі Таварыства ратавання на водах выцягнулі на бераг шасцікласніка мясцовай школы. Як потым было ўстаноўлена, ідучы да неабсталяванага месца для купання ўздоўж берага па вадзе, падлетак 2010 года нараджэння ўступіў у падводную яму — яго стала выносіць плынню. Выратаваць дзіця не паспелі.

Трагічным стаў адпачынак і для адной з траіх сяброўак, якія бавілі час на гарадскім пляжы ў Паставах. Калі дзве дзяўчынкі далучыліся да групы падлеткаў, якія купаліся на большай глыбіні вады і далей ад берага, пацярпелая знаходзілася каля берага. Праз некаторы час, калі дзве дзяўчынкі і група падлеткаў, з якімі яны купаліся, вырашылі выйсці на бераг, то ўчапіліся за нешта нагой. Адзін з падлеткаў папрасіў у супрацоўніка Таварыства ратавання на водах маску і нырнуў у ваду, дзе ўбачыў цела дзяўчынкі, якая засталася чакаць сваіх сяброўак каля берага. Супрацоўнікі таварыства выцягнулі дзяўчынку з вады. Яна ўжо была без прыкмет жыцця.

Жудасны выпадак адбыўся ў Мінскім раёне. Амаль двухгадовая дзяўчынка патанула ў зборным басейне, глыбіня якога была меншай за метр. Як высветлілася, пакуль бацькі дзіцяці працавалі на ўчастку свайго прыватнага дома, дзяўчынка самастойна гуляла па двары без нагляду. А да бяды, як кажуць, шмат не трэба. Чаму малое дзіця знаходзілася без нагляду дарослых, разбіраюцца праваахоўныя органы.

— Як правіла, дзеці не шукаюць небяспеку, яны гуляюць, у тым ліку каля вадаёмаў, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Таму, каб пазбегнуць бяды, пэўнага інцыдэнту, неабходна пастаянна іх суправаджаць. Пры гэтым бацькі, іншыя дарослыя, якія адказваюць за дзяцей, павінны патлумачыць, якія небяспекі могуць іх чакаць. Калі дзіця зусім малое, неабходна трымаць яго на адлегласці выцягнутай рукі. Што датычыцца вады, то тут увогуле лепш трымаць дзіця за руку. Катэгарычна забараняецца злоўжываць спіртнымі напоямі, калі адпачываеце разам з дзецьмі каля вадаёма. Не бярыце дзяцей на возера або рэчку ў начны час. І, самае галоўнае, бацькам варта навучыць дзіця плаваць, каб у яго былі элементарныя навыкі паводзін на вадзе.

Для таго каб пазбегнуць трагедыі на вадзе, варта купацца толькі ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах, на абсталяваных пляжах, дзе ў выпадку няшчаснага выпадку можна разлічваць на дапамогу ратавальнікаў. Катэгарычна забараняецца купацца ў стане алкагольнага ап'янення. Не заплывайце за буйкі і іншыя агароджы, устаноўленыя ў месцах для купання. Не дапускайце свавольства на вадзе і не палохайце іншых. Не падавайце лжывых сігналаў бедства. Не рэкамендуецца купацца аднаму ў вячэрні і начны час. І яшчэ раз: не пакідайце дзяцей без нагляду!



### ДРУГІ ШАНЦ НА ЖЫЦЦІ

Як заўважае афіцыйны прадстаўнік МНС, нягледзячы на тое, што ў краіне функцыянуе каля 500 абсталяваных для купання пляжаў, некаторыя аддаюць перавагу адпачынку ў адзіноце або забароненым месцам для купання. «Ратавальнікі наведваюць і гэтыя месцы, аднак прадугледзець усё немагчыма, — падкрэслівае Яўген Бараноўскі. — У першую чаргу, кожны сам павінен прадбачыць пэўныя моманты, каб гарантаваць бяспеку сабе і сваім блізкім».

Дзякуючы ратавальнікам і супрацоўнікам Таварыства ратавання на водах, з пачатку купальнага сезона выратавана 50 чалавек, у тым ліку 17 дзяцей. Днямі супрацоўнікі таварыства аказалі дапамогу чацвярым рыбакам на возеры Лукомскае. Ранішняя рыбалка ледзь не скончылася трагедыяй для кампаніі з двух хлопцаў і дзвюх дзяўчат, якія рыбачылі на гумавай лодцы з маторам. З-за хваль і ветру лодка перакулілася — усе чацвёра апынуліся ў вадзе. На ўсіх былі надзеты выратавальныя камізэлькі, рыбакі змаглі ўзлезці на перакуленую лодку. У аднаго з хлопцаў у кішэні застаўся мабільны тэлефон, з якога яны патэлефанавалі ў службу ратавання. Супрацоўнікі МНС аператыўна перадалі інфармацыю на ратавальную станцыю Таварыства ратавання на водах, якая дыслацыруецца на возеры.

Ратавальнік Валерый Бартноўскі ў начны час дзяжурыў адзін. Пасля атрымання паведамлення аб здарэнні мужчына неадкладна выехаў да месца. На адлегласці каля двух кіламетраў ад берага ён убачыў чатырох чалавек, якія сядзелі на лодцы, якая перакулілася. Выратаваных разам з лодкай былі дастаўлены на бераг. Маладыя людзі змерзлі, аднак медыцынская дапамога ім не спатрэбілася.

Нядаўна супрацоўнікі таварыства дапамаглі бяспечна дабрацца да берага і жанчыне з дзіцем. Маці разам з сынам плавала на катамаране на возеры Лукомскае ў раёне вёскі Стоўбцы Чашніцкага раёна. З-за моцнай плыні самастойна даплысці да берага яны не змаглі. Ратавальнікі, да якіх па тэлефоне звярнулася жанчына, аператыўна перадалі інфармацыю супрацоўнікам Таварыства ратавання на водах. Супрацоўнікі таварыства на дапамогу прыплылі на катары. Жанчыну і яе сына 2015 года нараджэння ратавальнікі ўзялі на борт катара, замацавалі катамаран і ўсіх даставілі на бераг. У медыцынскай дапамозе выратаваныя не мелі патрэбы.

Часам на дапамогу тым, хто тоне, прыходзяць відавочцы. Так, днямі жанчына, якая адпачывала на адным з брэсцкіх пляжаў, выратавала дзіця. Па папярэдняй інфармацыі, хлопчык 2017 года нараджэння знаходзіўся на вадаёме з мамай. Скачучы з берага, ён стукнуўся аб ваду і страціў прытомнасць.

— Мы дзяжурылі на вадаёме і пачулі крыкі: людзі клікалі на дапамогу, — расказаў ратавальнік Уладзімір Басалай. — Прыбегшы, убачылі, як жанчына спрабавала дапамагчы дзіцяці, накіроўваючыся з ім да берага. Забралі ў яе хлопчыка ў непрытомным стане. Да прыбыцця брыгады хуткай медыцынскай дапамогі я і калегі Аляксандр Фаменка, Сяргей Кавальчук праводзілі сардэчна-лёгачную рэанімацыю — хлопчык прыйшоў у сябе.

Дзіця перадалі медыкам: яго шпіталізавалі ва ўстанову аховы здароўя. Словам, месца здарэння для купання не абсталявана. Аб гэтым сведчыць і ўказальная таблічка «Купанне забаронена», аднак людзі чамусьці не бачаць яе або не хочуць бачыць.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з сайта МНС.**

### Калі вы бачыце, што нехта тоне:

— паклічце на дапамогу іншых людзей або супрацоўнікаў Таварыства ратавання на водах, калі яны ёсць побач;

— патэлефануйце ў МНС (па нумарах 101 або 112) і выклічце хуткую дапамогу (па тэлефоне 103);

— кіньце таму, хто тоне, ратавальны круг або доўгую вяроўку з вузлом на канцы (калі яны ёсць);

— калі маецца лодка, падплывіце да чалавека і паспрабуйце дапамагчы;

— калі вы плаваеце добра і ўпэўнены ў сваіх сілах, паспрабуйце дабрацца да чалавека самастойна: абхапіце яго ззаду за плечы і паспрабуйце пазбегнуць спроб схапіцца за вас, якія ў паніцы будзе рабіць той, хто тоне, — і плывіце з ім назад;

— калі чалавек знаходзіцца без прытомнасці, цягніце яго да берага, узяўшы рукой пад падбародак такім чынам, каб яго твар пастаянна знаходзіўся над паверхняй вады;

— да прыбыцця медыкаў па магчымасці прыступіце да аказання першай дапамогі.

---

Надвор'е

# Спякота і дождж амаль як у тропіках

## Да нас ідуць залевы



**На старце ліпеня надвор'е ў нашай краіне будзе насіць па-сапраўднаму летні, але няўстойлівы характар, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Мяркуецца, што ў сераду ініцыятыва ў атмасферы будзе належаць пераважна вобласці павышанага атмасфернага ціску, толькі ў паўднёва-ўсходніх раёнах краіны ўмовамі надвор'я будзе кіраваць атмасферны фронт. Таму толькі днём у асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі прагрымяць навальніцы. Удзень паветра прагрэецца да 24—30 градусаў.

У чацвер чакаецца перамяшчэнне на тэрыторыю Беларусі актыўнай франтальнай сістэмы з паўднёвага захаду Еўропы. Гэтая сістэма прынясе на большай частцы тэрыторыі краіны дажджы рознай інтэнсіўнасці. Месцамі яны будуць дасягаць крытэрыяў моцных, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Днём пры навальніцах будзе ўзмацняцца вецер парывамі да 15—20 м/с, магчымы град. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад 13 да 19 градусаў. Днём слупок тэрмометра падымецца да 22—27 градусаў, а па паўднёвым усходзе — да 28—30 градусаў.

Дастаткова вільготна і горача будзе і ў пятніцу. У гэты дзень у нашай краіне яшчэ захаваецца ўплыў франтальнай сістэмы, якая павольна ссоўваецца на паўднёвы ўсход краіны. Таму ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём пераважна па паўднёва-ўсходняй палове пройдуць дажджы, месцамі моцныя, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 10 да 17 градусаў, а ўдзень — ад 19 да 25 градусаў. На паўднёвым усходзе ноччу прагназуецца 18—20 градусаў, а днём — 26—28 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на выхадныя франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю нашай краіны, таму фон атмасфернага ціску пачне расці, і нас чакае па-ліпеньску цёплае і без істотных ападкаў надвор'е. Толькі ў суботу ў асобных раёнах па ўсходзе, а днём у нядзелю месцамі па паўночным захадзе краіны ёсць верагоднасць летніх навальнічных дажджоў.

У суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 9 градусаў па захадзе да 18 градусаў па ўсходзе краіны. Удзень чакаецца 22—27 градусаў, а месцамі — 19—21 градус.

У нядзелю прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па паўночным захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы тэмпература будзе ў межах ад плюс 8 градусаў па паўночным захадзе да 16 градусаў па паўднёвым усходзе. Днём сіноптыкі абяцаюць 19—26 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Тонкасці прафесіі

# АДНА СЛУЖБА НА ДВАІХ

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў кіналагічным цэнтры Узброеных Сіл, дзе пазнаёміліся з ваеннаслужачымі і іх гадаванцамі

**Ці ведалі вы, што ў беларускай арміі ёсць падраздзяленне, дзе разам з вайскоўцамі праходзяць службу чатырохлапыя сябры? У кіналагічным цэнтры Узброеных Сіл Беларусі разам з ваеннаслужачымі пастаўленыя задачы выконваюць нямецкія, бельгійскія і каўказскія аўчаркі, а таксама лабрадоры. Яны ахоўваюць важныя аб'екты і патрулююць пэўную тэрыторыю, знаходзяць выбуховыя рэчывы і наркотыкі, трапляюць на чалавека па следзе — і гэта яшчэ не ўвесь спектр здольнасцяў, якім валодаюць чатырохлапыя байцы.**



Дзмітрый ТАТАРЫНАЎ з бельгійскай аўчаркай па мянушцы Зеўс.

Днямі карэспандэнты пабывалі ў кіналагічным цэнтры і пазнаёміліся як з сабакамі, так і з ваеннаслужачымі, дзякуючы якім гадаванцы могуць многае. Якім чынам праходзіць навучанне чатырохлапых, як выбіраюцца мянушкі для жывёл і чаму без даверу паміж ваеннаслужачым і сабакам не атрымаецца выніку — у нашай публікацыі.

### Жывёлу трэба палюбіць

Калі карэспандэнты прыехалі ў падраздзяленне, **старшы інструктар спецыяльнай групы спецыяльнага аддзялення Дзмітрый ТАТАРЫНАЎ** знаходзіўся са сваім чатырохлапым падапечным на вуліцы. Як і людзі, сабакі маюць патрэбу ў рэгулярных прагулках на свежым паветры. Зеўсу (менавіта так завуць гадаванца кінолага), бясспрэчна, падабаецца такое баўленне часу. Чаго не скажаш наконт рэакцыі бельгійскай аўчаркі на размову яго гаспадара з журналістамі. «Відаць, раўнуе, што не толькі яму ўвага», — тлумачыць сяржант кантрактнай службы.

Ужо на працягу некалькіх месяцаў Дзмітрый служыць у арміі на прафесійнай аснове. У кіналагічны цэнтр трапіў па прызыве. Перад арміяй скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, працаваў адпрацоўку ў Навагрудку, дзе трэніраваў дзяцей у лыжных гонках. Ідучы ў армію, планаваў сюды вярнуцца. Аднак за месяц да дэмбеля малады чалавек заключыў з воінскай часцю кантракт.

«Мне спадабалася ваеннае жыццё, захапіўся кіналогіяй», — прызнаецца ваеннаслужачы. Ды і што хаваць, прызвычаіўся да свайго гадаванца — разам з Зеўсам яны нясуць службу ўжо практычна два гады. Сабака дастаўся Дзмітрыю ад іншага гаспадара. На цяперашні момант Зеўсу чатыры гады — росквіт жыцця для службовага сабакі.

Калі ваеннаслужачы быў малы, у сям'і была сабака — нямецкая аўчарка. Аднак, як прызнаецца малады чалавек, камандаў яна ніякіх не выконвала. Проста бегала па двары і раз-пораз брахала на выпадковых прахожых. Пазнаёміўшыся з Зеўсам, Дзмітрый даведаўся, што такое дрэсіроўка.

«Кіналогію спачатку асвойваў па падручніках, — расказвае сяржант. — Затым мы са сваімі гадаванцамі гулялі, каб сабакі прызвычайваліся да нашых манер, голасу, жэстаў. Пасля Зеўс асвойваў каманды і ўвогуле зразумеў, што такое дысцыпліна. Чалавеку, які любіць сабак, будзе прасцей знайсці падыход да жывёлы. Сабаку цяжка прыстасавацца да другога гаспадара, таму спатрэбіўся час, каб прызвычаіцца да мяне. Нам хапіла двух тыдняў».

Зеўс — сабака-спартсмен. Ён — рэгулярны ўдзельнік Армейскіх міжнародных гульняў. Летась свае магчымасці бельгійская аўчарка нядрэнна паказала на спаборніцтвах на Узбекістане, дзе зборная кінолагаў беларускай арміі атрымала «бронзу».

Яшчэ нядаўна Дзмітрый сам спасцігаў азы кіналогіі, а цяпер ужо вучыць новае папаўненне салдат разумець сабак і ставіць ім задачы. Ваеннаслужачыя не толькі рыхтуюць сваіх гадаванцаў для канкрэтных дзеянняў, але і поўнасцю забяспечваюць побыт сваіх чатырохлапых сяброў: кормяць, пояць, вычэсваюць, мыюць, гуляюць, прыбіраюць за імі. Сабак, дарэчы, кормяць выключна сухім кормам. Дарослай аўчарцы ў дзень неабходна 650 грамаў ежы.

Чатырохлапыя вельмі хутка прывязваюцца да сваіх гаспадароў. Як расказвае Дзмітрый, варта яму два дні не з'явіцца ў вальеры, як Зеўс ужо пачынае сумаваць. А падчас сустрэчы рэакцыя ў сабакі самая шчырая — жывёлы не ўмеюць хаваць сваю радасць.

### Нязлосны Злодзей

Карэспандэнты пацікавіліся, па якім прынцыпе ў кіналагічным цэнтры сабакам даюцца мянушкі. Аказваецца, у свой час спецыялістамі была створана табліца, у якой у алфавітным парадку на кожную літару прыведзены шэраг імён — у адпаведнасці з палавой прыналежнасцю, вядома. Прысвойванне імён адбываецца строга паслядоўна: пачынаючы з першай літары алфавіта, кожны новы памёт года называецца на адну літару. Напрыклад, першы памёт — выключна на літару «А», другі — на «Б» і гэтак далей. Бывае, што мянушкі паўтараюцца, але ваеннаслужачыя цэнтра рэгулярна папаўняюць табліцу новымі сабачымі іменамі.

Гадаванца **старшага інструктара курса спецыяльнай падрыхтоўкі па спецыяльных службах сабак службовага сабакаводства Анастасіі КАНАШЭВІЧ** завуць Злодзей. Гэта акурат той самы выпадак, калі як карабель назавеш, так ён і паплыве. Злодзей — сабака, мякка кажучы, з характарам. Як расказваюць кінолагі, хтосьці з чужых наўрад ці спакойна мог бы каля яго прайсці. Аднак так было пры ранейшым гаспадары. Калі ў Злодзея з'явілася гаспадыня, характар сабакі рэзка памяняўся: ён стаў больш дысцыплінаваны і спакойны. Вось і вер пасля ў тое, што нельга касцы перавыхаваць.

Анастасію запрасілі ў кіналагічны цэнтр, калі яна праходзіла службу ў палку сувязі. Дзяўчына — майстар спорту па вольнай барацьбе. У арміі ўдзельнічала ў прыкладных ваенных мнагабор'ях, паказвала добрыя вынікі. Аднак так атрымалася, што ёсць у Анастасіі і яшчэ адзін талент — яна выдатна знаходзіць агульную мову са службовымі сабакамі. Такімі здольнасцямі, дарэчы, валодае не кожны прафесійны кінолаг.

Анастасія і Злодзей — спартыўны тандэм. Разам яны выступалі на Армейскіх міжнародных гульнях (конкурс «Верны сябар») ва Узбекістане, занялі трэцяе месца. «Мы нават з ім характарамі падобныя, — расказвае пра свайго гадаванца ваеннаслужачая. — Ён — халерык, і я такая ж. Мы любім бегаць, скакаць. Таму нядзіўна, што мы са Злодзеем вельмі хутка сышліся».

Злодзей — вышуковая сабака. Кінолаг прызнаецца, што ў першыя дні знаёмства з бельгійскай аўчаркай (малінуа) у яе былі сумненні, ці ўдасца справіцца. Па-першае, сабака дзяўчыне дастаўся ўжо дарослы. Па-другое, яна ніколі не займалася кіналогіяй. Па-трэцяе, у Злодзея дагэтуль ужо былі гаспадары, да якіх ён прызвычаіўся. Аднак, як кажуць, гэта была любоў з першага позірку.

«Сабакі ўсё адчуваюць: і наш настрой, і перажыванні, і пачуцці, — тлумачыць прычыны іх хуткага ўзаемапаразумення Анастасія. — Магчыма, я да яго адношуся лепш, чым іншыя гаспадары, таму ўсё і атрымалася. Сабакі ж як дзеці. Толькі размаўляць не ўмеюць, а так з імі вельмі цікава».

Пры гэтым кінолаг адзначае, што нельга ва ўзаемаадносінах са службовым сабакам быць заўсёды добрым і ласкавым. Дысцыпліна — гэта тое, без чаго не будзе добрага выніку падчас выканання задач па прызначэнні. Гэта датычыцца як і сабакі, так і чалавека. Анастасія прызнаецца, што ў арміі ўжо тры год, але аб гэтым рашэнні — звязаць свой лёс з абаронай Айчыны — ні разу не пашкадавала.

### Сабака — складаны арганізм

У кіналагічным цэнтры ёсць і свой гадавальнік. Менавіта тут шчанюкі з'яўляюцца на свет. На працягу месяца-паўтара малыя знаходзяцца з мамай. Як толькі шчанюк перастае мець патрэбу ў матчыным малацэ і здольны есці звычайную ежу, яго ад маці адлучаюць. Як кажуць спецыялісты, чым раней гэта адбудзецца, тым лепш сабака будзе выконваць пастаўленыя задачы. Пасля таго, як сабака-маці пакідае гадавальнік, шчанюкі жывуць тут яшчэ тры месяцы і толькі потым пачынаюць знаёміцца са сваім новым месцам жыхарства — вальерам.

Нягледзячы на тое, што вальераў, дзе жывуць сабакі, у цэнтры даволі шмат, разнастайнасці парод тут не ўбачыш. Для службы ва Узброеных Сілах ажыццяўляецца падрыхтоўка канкрэтных парод сабак.

— Нямецкая аўчарка — незаменны памочнік у любым відзе дзейнасці: у пошуку чалавека, выбуховых рэчываў, наркатычных сродкаў, патрульнай і каравульнай службе, — расказвае **намеснік начальніка кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл па спецыяльнай службе падпалкоўнік Валерый РЫК.** — Бельгійская аўчарка (малінуа) таксама здольная выканаць усе пералічаныя вышэй задачы. Яшчэ ў нас ёсць каўказскія аўчаркі, прызначаныя выключна для каравульнай і вартаўнічай службы. Сярэднеазіяцкія аўчаркі ў асноўным прымяняюцца ў каравульнай дзейнасці, лабрадоры — у пошуку выбуховых рэчываў і наркатычных сродкаў, а таксама для племянной дзейнасці.



Нязлосны Злодзей і кінолаг Анастасія КАНАШЭВІЧ.

Нягледзячы на тое, што праграма, па якой рыхтуюцца кінолагі, ужо сябе зарэкамендавала, сёлета яна зведала некаторыя змяненні — практычных заняткаў стала больш. Як адзначыў Валерый Рык, тэматыка тэарэтычнай падрыхтоўкі зменена з улікам сучасных тэндэнцый. Аднак усё гэта не мае сэнсу, калі паміж чалавекам і сабакам не ўстаноўлены кантакт. «Сабака — гэта не ружжо, не аўтамат, не пісталет і не танк, — заўважае Валерый Рык. — Гэта складаны арганізм, і неабходна разумець, як ён функцыянуе. Вывучыць на працягу гадзіны прынцып паводзін сабакі не атрымаецца. Таму на працягу двух тыдняў адбываецца толькі тэарэтычная падрыхтоўка. Акрамя таго, у гэты перыяд ажыццяўляецца прызвычайванне будучых спецыялістаў да службовых сабак. Мы, у сваю чаргу, вывучаем індывідуальныя асаблівасці кожнага чалавека, і, зыходзячы з іх, замацоўваем за ім канкрэтнага сабаку для далейшай падрыхтоўкі».

У лістападзе кіналагічнаму цэнтру спаўняецца 30 гадоў. З іх 23 гады тут служыць Валерый Рык. Прыйшоў сюды цяперашні намеснік начальніка цэнтра салдатам тэрміновай службы. Да службы ў арміі, як ён прызнаецца, слаба ўяўляў, што такое кіналогія. Планаваў адслужыць патрэбны тэрмін і працягваць займацца любімай справай — да службы Валерый Ігаравіч займаўся з дзецьмі ў гуртках. Так атрымалася, што менавіта ў арміі ён знайшоў сваё сапраўднае прызванне.

— Першага майго сабаку звалі Грын — гэта ўсходне-азіяцкая аўчарка, — расказвае намеснік начальніка цэнтра. — Ён мне дастаўся ва ўзросце 3,5 года. Гэта быў дастаткова мацёры сабака. Мы з ім доўга наладжвалі кантакт, але змаглі знайсці ўзаемапаразуменне і служылі потым дастаткова доўга. Паралельна са мной служыў лабрадор Амальгама, рыхтаваў я яго да пошуку выбуховых рэчываў. Амальгама і яго сястра Аказія сталі аднымі з першых сабак, падрыхтаванымі ва Узброеных Сілах для гэтай мэты. Потым пайшло як па наезджаным: адзін сабака, другі, потым трэці дабавіўся — у выніку было іх вельмі шмат. Запомнілася бельгійская аўчарка па мянушцы Аконт: яна магла за тры скачкі забрацца на чатырохметровую лесвіцу, пераскочыць з вальера ў вальер, хадзіла па плоце...

Валерый Рык як ніхто ведае, што такое сяброўства паміж сабакам і чалавекам. «Сабакі вельмі старанна вывучаюць нас і значна хутчэй нас разумеюць, чым мы іх, — раскрывае дэталі намеснік начальніка кіналагічнага цэнтра. — Бывае, што ты яшчэ нічога і не зрабіў, а сабака ўжо выканаў тое, што ты хацеў».

Словам, знойдзены па следзе ў глухім лесе чалавек або ўказанне на толькі адну з дзясятак сумак, дзе ляжыць выбуховае або наркатычнае рэчыва, — гэта не звышздольнасці чатырохлапых. За гэтымі вынікамі стаіць штодзённая праца сабакі і чалавека, без якога з самых верных сяброў наўрад ці атрымаліся б надзейныя байцы.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Сацыяльны вектар

# У ЗДАРОВЫМ ЦЕЛЕ — ЗДАРОВЫ ДУХ

## Пасля рэканструкцыі адкрыўся амбулаторны цэнтр 432-га галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл

**У сучаснай установе аховы здароўя створаны ўсе ўмовы — як для медыцынскага персаналу, так і для пацыентаў. Ваеннаслужачыя, а таксама члены іх сем'яў, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных Сіл атрымалі магчымасць у адным месцы прайсці дыягностыку па шырокім спектры захворванняў, пракансультавацца ў высокакваліфікаваных спецыялістаў, скарыстацца комплексам працэдур і паклапаціцца аб прафілактыцы тых ці іншых захворванняў. Дарэчы, усе паслугі цэнтра даступныя і для грамадзянскага насельніцтва, праўда, на платнай аснове.**



Як адзначыў падчас урачыстага адкрыцця цэнтра **намеснік міністра абароны па тыле — начальнік тылу Узброеных Сіл генерал-маёр Андрэй БУРДЫКА**, у нашай дзяржаве здароўю насельніцтва (і ваеннаслужачыя — не выключэнне) удзяляецца вялікая ўвага. «Самае галоўнае — вы павінны разумець, што не пацыент вам нешта павінен, а вы — пацыенту, — звяртаючыся да медыцынскага персаналу цэнтра, заўважыў ён. — Да пацыентаў патрэбна асаблівая ўвага».

Намеснік міністра пажадаў супрацоўнікам плёну ў паўсядзённай дзейнасці, а таксама падтрымання высокага ўзроўню медыцынскага забеспячэння, якім славіцца 432-і галоўны ваенны клінічны медыцынскі цэнтр Узброеных Сіл.

Амбулаторны цэнтр, рэканструкцыя якога ажыццяўлялася на працягу двух гадоў, — гэта шматпрофільны комплекс, які мае 15 аддзяленняў і 11 спецыялізаваных кабінетаў, прызначаных для аказання медыцынскай дапамогі. Цэнтр абсталяваны самым сучасным медыцынскім абсталяваннем, якое дазваляе праводзіць рэнтгенаўскія, ультрагукавыя, эндаскапічныя і іншыя даследаванні. Усё абсталяванне поўнасцю новае.

Як расказала **начальнік амбулаторнага цэнтра 432-га галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл палкоўнік медыцынскай службы Вольга ЛАЎРЭЦКАЯ**, у цэнтры з'явіўся такі ўнікальны апарат, як дэнсітометр, які дазваляе вымяраць шчыльнасць касцей. Гэтае абсталяванне, па яе словах, вельмі неабходнае ў дыягностыцы астэапарозу. «Рэнтген-аддзяленне абсталявана шасцю навейшымі апаратамі, у тым ліку айчыннай вытворчасці, з вельмі высокай адрознівальнай здольнасцю», — адзначыла начальнік амбулаторнага цэнтра.

Што датычыцца кадраў, медыцынскае падраздзяленне практычна поўнасцю ўкамплектавана. Згодна са штатным раскладам, у цэнтры працуе 165 чалавек, сярод іх — сем ваеннаслужачых і 158 асоб грамадзянскага персаналу. Праўда, як адзначыла кіраўнік установы, маюцца і вакантныя пасады: у прыватнасці, урачоў і сярэдняга медперсаналу.

— У Беларусі ёсць добрая традыцыя — адкрываць знакавыя сацыяльныя аб'екты перад святамі, — звярнуў увагу **начальнік ваенна-медыцынскага ўпраўлення Міністэрства абароны палкоўнік медыцынскай службы Аляксандр МАЛЮХ.** — Гэта сведчыць аб сацыяльнай палітыцы нашай дзяржавы, накіраванай у тым ліку і на клопат аб здароўі нашых грамадзян. Амбулаторны цэнтр не саступае многім шматпрофільным цэнтрам краіны. Ен з'яўляецца адным з асноўных падраздзяленняў 432-га галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл. Ваенны шпіталь, як у народзе называюць 432-гі цэнтр (быў адкрыты ў жніўні 1805 года. — **«Зв».**), з'яўляецца найстарэйшай медыцынскай установай краіны. З уводам у эксплуатацыю амбулаторнага цэнтра рэканструкцыя шпіталя поўнасцю завершана.

Нягледзячы на функцыянаванне амбулаторнага цэнтра ў новым рэжыме, сюды звяртаецца да тысячы чалавек у суткі. Варта заўважыць, што сяміпавярховы будынак цэнтр дзеліць разам з кафедрай ваенна-палявой тэрапіі, аддзяленнем лабараторнай дыягностыкі і цэнтральнай ваенна-ўрачэбнай камісіяй.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

Праверана на сабе

# МЕСЦА, ДЗЕ СПЫНЯЕЦЦА ЧАС

## Што такое гаўптвахта і хто туды можа трапіць?

**Пра гэтае падраздзяленне Мінскай ваеннай камендатуры чулі многія, але рэальную карціну, бадай, не бачыў ніхто. Арганізаваць рэпартаж на гаўптвахце, якую ў народзе завуць «губой», грамадзянскім журналістам немагчыма. Выключэнне зрабілі ваенным карэспандэнтам.**



### Распарадак дня — манатонны

Першая гарнізонная гаўптвахта з'явілася ў Расійскай імперыі ў 1701 годзе пры Пятры I. У той час такі від спагнання прымяняўся толькі да афіцэраў. У беларускай арміі дысцыплінарнаму арышту могуць падвяргацца салдаты і сяржанты тэрміновай і кантрактнай службы, а таксама прапаршчыкі. Па крымінальных артыкулах, да рашэння суда на гаўптвахце могуць утрымлівацца і афіцэры.

Гаўптвахта ў Мінскай ваеннай камендатуры — адзіная ў Беларусі. Адбываюць пакаранне тут не толькі вайскоўцы, але і прадстаўнікі ўсіх сілавых структур. Нягледзячы на свежы рамонт і залітыя святлом калідоры, атмасфера прыгнятальная. Цішыня, якая парушаецца толькі крокамі вартавога, глухія металічныя дзверы, за якімі знаходзяцца арыштаваныя, паветра быццам прасякнута віной і раскаяннем...

Камеры бываюць адзіночныя і групавыя: для салдат, сяржантаў, прапаршчыкаў. Падставы адправіцца на гаўптвахту розныя: нестатутныя адносіны, самавольная адлучка з воінскай часці, грубае парушэнне дысцыпліны. Колькасць сутак арышту залежыць ад ступені правіны. Нават нязначная памылка можа пацягнуць за сабой трагедыю. Армія — не месца для вольнасцяў і эксперыментаў са статутам.

Арыштаваны Алег (імя зменена) на гаўптвахце знаходзіцца другі раз. Упершыню трапіў туды за сістэматычнае парушэнне воінскай дысцыпліны: спазняўся ў строй, парушаў дысцыпліну ў страі. Другі раз апынуўся на «губе» за невыкананне пастаўленых задач камандзіра.



— Тут не тое месца, дзе хочацца пабываць, — расказвае Алег. — Адчуваеш сябе нават не птушкай у клетцы. Тут ты не бачыш рэальнасці, свабоды. Самае лепшае для арыштаванага — працаваць на тэрыторыі, бо час хутчэй праходзіць.

У чатырох сценах час быццам спыняецца. Распарадак дня манатонны. Пад'ём — у пяць раніцы, снядань. Астатні час — вывучэнне статута або гаспадарчыя работы, кароткія прагулкі на свежым паветры.

У камеры нельга хадзіць, размаўляць паміж сабой, класціся ці прысаджвацца можна толькі з дазволу асабовага складу каравульнай службы. Адзінае, што тут можна, — гэта вучыць статут і думаць аб учынку, які здзейсніў, каб не паўтарыць падобнае ізноў.

— Самае цяжкае, мусіць, гэта сядзець, — прызнаецца арыштаваны. — Ты не ведаеш, чаго чакаць далей. Напэўна, на грамадзянцы прайшло б ужо дзесяць сутак хутчэй, чым два дні на гаўптвахце. Самае страшнае, што могуць падоўжыць тэрмін арышту.

### Вучыць і думаць

Быў час, калі вайскоўцы адбывалі пакаранне ў дысцыплінарным батальёне. Праўда, гэта датычылася злачынстваў, учыненых па крымінальных артыкулах. Мы вырашылі наведаць знакаміты «дызель», як называлі дысцыплінарны батальён, праз дзесяць гадоў пасля яго расфарміравання.

Масюкоўшчына. Вуліца Лынькова, 124. Калісьці на гэтым месцы дыслакаваўся 8-ы асобны дысбат. Тут адбывалі пакаранне вайскоўцы за ўчыненыя ваенныя злачынствы. У сакавіку 2011 года батальён быў расфарміраваны. А калісьці на гэтым пляцы знаходзілася 2,5 тысячы асуджаных. Цяпер тут гуляе толькі вецер, а на месцы казармаў — трава і дрэвы.

Пасля стварэння нацыянальнай арміі ва Узброеных Сілах Беларусі абстаноўка з дысцыплінай кардынальна змянілася. Статыстыка і стала галоўным аргументам для ліквідацыі батальёна. Сёння з функцыяй «розгі» для тых, хто аступіўся, спраўляецца гаўптвахта. Тых, хто пераступіў рысу закона, накіроўваюць у папраўчыя ўстановы. Але такіх выпадкаў адзінкі.

У Мінскай ваеннай камендатуры функцыянуе аддзел дазнання і вышуку. Афіцэры падраздзялення сумяшчаюць працу супрацоўнікаў крымінальнага вышуку і дазнаўцаў. Пошук асоб, якія ўхіліліся ад вайсковай службы і дэзерціраў, перадача спраў у Следчы камітэт — тое, чым займаецца ваенны следчы. Дарэчы, менавіта ён узаемадзейнічае з вайскоўцамі на гаўптвахце.

Паведамленні аб пакіданні воінскіх часцей аператыўна паступаюць у дзяжурную часць камендатуры. Ужо праз хвіліну на пошук накіроўваецца група спецыяльнага рэагавання. Асноўная задача падраздзялення — вышук ваеннаслужачых тэрміновай службы, якія самавольна пакінулі воінскую часць. Нягледзячы на тое, што такія выпадкі вельмі рэдкія, механізм дзеяння адпрацаваны да аўтаматызму.

Як прызнаецца арыштаваны Алег, гаўптвахта вучыць многім рэчам. «Тут вельмі строга, сюды трапляеш не за добрыя ўчынкі, — удакладняе малады чалавек. — Усё — паводле патрабаванняў статута, павышаная патрабавальнасць. Ты павінен вучыць абавязкі вайскоўца».

Застаўца сам-насам з сабой, днямі напралёт разважаць аб правіне, зубрыць артыкулы статута... І думаць, думаць аб сваім месцы ў жыцці, несправядлівасці, зменлівасці лёсу. Гаўптвахта — не прысуд для вайскоўца. Адбыўшы пакаранне, ён вяртаецца ў строй і працягвае несці службу. А як яна будзе складвацца — залежыць толькі ад чалавека.

**Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ.**
**Фота з архіва аўтара.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# ЯК СТРЫМАЦЬ РОСТ ГУЗА НА НАЗЕ?

**Прыгожыя высокія абцасы ці зручныя балеткі і кеды? Незалежна ад выбару ўвесь гэты абутак лічыцца няправільным. І самае частае наступства яго нашэння — так званая папярочная плоскаступнёвасць, больш вядомая як гуз, ці костачка, на назе.**



## На абцасах і без

На прыёме ў артапедаў з такой праблемай у 85 % выпадкаў сутыкаюцца жанчыны ва ўзросце за 40—50 гадоў. Як правіла, прыходзяць яны, калі нага пачала балець, прычым не толькі падчас нашэння нязручнага абутку, а пастаянна.

Пры хадзьбе на абцасах нагрузка ідзе на пярэднюю частку ступні. А з-за таго што носік абутку часта бывае завужаны, гэта стварае дадатковую нагрузку. У выніку пальцы зводзяцца адзін да аднаго, а ў вялікага з'яўляецца так званая костачка, або hallux («першы палец ступні») valgus («скрыўлены»). Павышае рызыку развіцця вальгуснай дэфармацыі работа «на нагах» і лішняя вага.

Першапачаткова гэта касметычны дэфект, але прагрэсіруе ён няўхільна, і з часам з'яўляюцца болі — вакол сустава ўзнікае запаленне. Прыкладна ў гэты ж час пачынаецца і старэнне сустава, і да ўжо наяўнай праблемы далучаецца артроз.

Вылучаюць некалькі стадый вальгуснай дэфармацыі. Прычым яны вызначаюцца не па памеры костачкі на нагах, а па велічыні вальгуснага вугла. На першай стадыі непрыемныя адчуванні практычна адсутнічаюць, вонкава заўважны невялікі бугарок каля асновы вялікага пальца, магчыма пачырваненне скуры ў вобласці костачкі з-за пастаяннага трэння. На другой стадыі эпізадычна ўзнікае болевы сіндром, бугарок павялічваецца ў памерах, прысутнічае ацёчнасць і запаленне сустава.

Пры найцяжэйшай стадыі адхіленне вялікага пальца і костачка на назе добра прыкметныя, з'яўляюцца рэзкія цяжкія болі, пад пальцамі ўтвараюцца натоптышы і мазалі. Боль прысутнічае ўвесь час, назіраецца дэфармацыя іншых пальцаў ступні.

Немалую ролю ў з'яўленні гэтай хваробы адыгрывае спадчыннасць. Калі ў бабулі, мамы ёсць на ступні такі гуз, то, хутчэй за ўсё, і дзецям не атрымаецца пазбегнуць гэтай праявы. Дарэчы вальгусная дэфармацыя ступні можа з'явіцца і ў мужчын. Уся справа ў эластычнасці звязкавага апарату: калі па якой-небудзь прычыне ён слабейшы, то костачка на назе можа пачаць расці нават у тых, хто ніколі не хадзіў на высокім абцасе.

## Аперацыя — крайняя мера

Заўважыўшы на назе костачку, артапеды рэкамендуюць звярнуцца да ўрача. Але часцей на прыём прыходзяць ужо з болем і вялікай дэфармацыяй, калі адзіным спосабам лячэння становіцца хірургічны. Аперацый, якія дазваляюць выправіць скрыўленне, мноства, па сутнасці яны дзеляцца на дзве вялікія групы: калі ламаецца ці выпілоўваецца костка або абыходзяцца карэкцыяй мяккіх тканак.

На пачатковых стадыях косткі не чапаюць, але пры запушчанай праблеме даводзіцца карэкціраваць сустаў, ламаць косці, а потым з дапамогай спецыяльных шрубак фіксаваць іх у правільным становішчы.

Тэрмін зрашчэння пераломў — чатырыпяць тыдняў. Але ўжо на другія суткі пацыенты могуць хадзіць самастойна. Гіпс не накладваюць, замест яго нагу фіксуюць спецыяльныя чаравікі Барука. Дарэчы, па гэтай жа прычыне аперацыю часта робяць на дзвюх нагах адначасова, бо дэфармацыя часам з'яўляецца на абедзвюх ступнях. Праз тры-пяць дзён пацыента адпраўляюць дадому. Ён можа займацца хатнімі справамі, схадзіць у краму, адзіная ўмова — не здымаць чаравікі.

Нялечаная вальгусная дэфармацыя можа прывесці да вельмі сур'ёзных праблем са здароўем. Хвароба змяняе ўсю форму ступні. Следам адбываецца пераразмеркаванне нагрузкі цела на іншыя суставы ног. Як вынік, разбураюцца храстковыя сустаўныя паверхні, развіваюцца артрозы, скрыўленне пазванкоў, астэахандроз, выпадае міжпазванкавая грыжа.

## Зняць нагрузку

Галоўнае ў прафілактыцы дэфармацыі ступні — нашэнне правільнага абутку. Акрамя гэтага, можна выкарыстоўваць спецыяльныя ўкладышы і вусцілкі для таго, каб скарэкціраваць становішча ступні, зніזіўшы ціск на пальцы. Таксама ў некаторых выпадках для таго, каб пазбавіцца ад гуза на нагах, выкарыстоўваюць так званыя артрэзы — яны пераразмяркоўваюць нагрузку на пашкоджаны сустаў.

Падобныя ўкладышы можна набыць практычна ў любой аптэцы. Галоўнае, перш чым выкарыстоўваць, трэба праканацца ў тым, што ён менавіта здымае напружанне з пашкоджанага ўчастка, а не траўміруе нагу яшчэ больш.

Дапаможа і лячэбная фізкультура. Пры адчуванні «калянасці» ў пальцах ног невялікая расцяжка дапаможа расслабіць мышцы і суняць сустаўны боль. Паспрабуйце сціскаць пальцы ног, пракатваць ступнямі па тэнісным мячы, а таксама зрабіце невялікі масаж. Для таго каб якасна расцягнуць пашкоджаны сустаў, максімальна выцягніце наскі і трымайце іх у такім становішчы пяць секунд, затым максімальна сцісніце яшчэ на пяць секунд, паўтарайце ад дзесяці і больш разоў на працягу дня. Таксама можна згарнуць у рулон мяккі ручнік і «пракатваць» па ім пашкоджаны палец.

## Якія абутак трэба насіць?

Са зручнай калодкай, якая дапамагае мінімізаваць напружанне на ступню, з мяккай падэшвай і цвёрдым супінатарам, са зручным наском, які не сціскае пальцы і не дастаўляе іншых нязручнасцяў, з няплоскай падэшвай, але і з невысокім абцасам (аптымальная вышыня — 2-4 см), з анатамічна правільнай формай вусцілак. Таксама абавязковым фактарам з'яўляецца выкарыстанне натуральных матэрыялаў.

## Пакутуюць часцей жанчыны

Шэраг даследаванняў паказаў, што амаль палова насельніцтва планеты ў той ці іншай меры пакутуе ад гуза на вялікім пальцы. Іншыя даследаванні выявілі, што сярэдняе адхіленне сустава вар'іруецца ад 23 да 35 працэнтаў. У большасці людзей костачка выступае нязначна і не прыносіць болю. З падобнай праблемай жанчыны сутыкаюцца значна часцей, чым мужчыны. Жанчынам не рэкамендавана насіць абцасы вышэй за 5 сантыметраў, бо яны могуць спрыяць з'яўленню гуза.

Костачка на вялікім пальцы нагі часцей за ўсё ўзнікае ў людзей, старэйшых за 65 гадоў. Аднак з гэтай праблемай могуць сутыкацца і маладыя. Дыягнаставаць падобнае захворванне можна, калі вялікі палец адхіляецца ад нармальнага становішча больш чым на 15 градусаў. Часцей за ўсё костачка ўзнікае ў людзей, якія аддаюць перавагу вузкаму абутку. Да іх ліку адносяцца многія танцоры і спартсмены.

Аперацыя пры дадзеным захворванні патрабуецца вельмі рэдка. Акрамя таго, шэраг даследаванняў паказаў, што да 35 % людзей, якія перанеслі падобную аперацыю, застаюцца незадаволены атрыманым вынікам.

# АДПУДЗІЦЬ ЭНЦЭФАЛІТ

## Сезон актыўнасці кляшчоў працягваецца

**Эпідэміёлагі звяртаюць увагу, што ў Беларусі працягваецца сезон захваральнасці на клешчавыя інфекцыі — клешчавы вірусны энцэфаліт (КВЭ) і клешчавы барэліёз (хвароба Лайма). З пачатку гэтага года захваральнасць на хваробу Лайма і КВЭ ў краіне вырасла ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ў 2,3 і 1,6 раза адпаведна. Па тэрыторыі размеркавання клешчавага энцэфаліту лідзіруюць дзве вобласці — Брэсцкая і Гродзенская, на хваробу Лайма часцей захворвалі жыхары сталіцы і Брэсцкай вобласці.**

## Небяспека на дачных участках і пры наведванні лесу

Большасць выпадкаў клешчавых інфекцый узнікала пасля прысмоктвання заражаных іксодавых кляшчоў. Аднак заўсёды ёсць шанц заразіцца на клешчавы энцэфаліт пры ўжыванні ў ежу сырога (без пастэрызацыі і кіпячэння) казінага малака, асабліва ад коз, якія знаходзяцца на свабодным выпасе. Пакуль у краіне такіх выпадкаў не зарэгістравана, але неабходна ведаць, што малако коз трэба ўжываць толькі пасля 2-3 хвілін кіпячэння.

Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, па выніках эпідэміялагічнага расследавання ўстаноўлена, што з ліку хворых на хваробу Лайма 98 % пацыентаў не звярталіся своечасова па медыцынскую дапамогу і не атрымлівалі прафілактычнага лячэння пасля ўкусу кляшча. І нагадалі, што, нават калі клешч быў выдалены самастойна, гэта не можа выключаць паказанні неадкладнага (не пазней за 72 гадзіны) звароту ў паліклініку. Акрамя таго, сёлетнія выпадкі захворванняў на клешчавы энцэфаліт былі зарэгістраваны толькі ў непрышчэпленых асоб. Адным з хворых стаў работнік аднаго з лясніцтваў Брэсцкай вобласці, які раней адмовіўся ад вакцынацыі.

Сёлета ў арганізацыі аховы здароўя з прычыны прысмоктвання кляшча звярнуліся больш за шэсцьтысяч чалавек, у тым ліку больш за дзве тысячы дзяцей. Гэта ў 1,5 раза больш, чым за аналагічны перыяд 2022 года. Часцей з гэтай нагоды па медыцынскую дапамогу звярталіся мінчане, а таксама жыхары Гродзенскай і Магілёўскай вобласці. Апытанне хворых паказала, што найбольшая колькасць прысмоктвання кляшчоў адзначалася на дачных участках і ў сельскай мясцовасці (39,6 %), пры наведванні лесу (31,6 %), на тэрыторыі жылой забудовы і паркавай зоны гарадоў — 14,5 % ад усіх зарэгістраваных выпадкаў.

Па выніках энтамалагічнага назірання ўстаноўлена, што колькасць кляшчоў сёлета ў жылой забудове знаходзілася на ўзроўні паказчыкаў 2022 года і па краіне склала 1,6 экзэмпляра на сцяга/кіламетр (сцяга/км — гэта колькасць кляшчоў, якія збіраюцца адмысловым белым палотнішчам на дыстанцыі ў 1 км, — так устанаўліваецца сярэдні паказчык заклешчанасці). Найбольш высокія паказчыкі колькасці кляшчоў у прыродных біятопах (лясная зона) адзначаліся ў Брэсцкай, Гомельскай і Віцебскай вобласці (24,3, 21,4 і 17,5 экз. на сцяга/км адпаведна).

## Дзе больш за ўсё кляшчоў у Мінску?

У Мінску таксама выяўлена некалькі месцаў, дзе канцэнтрацыя кляшчоў перавышае дапушчальную. У прыватнасці, у лесапарку Уручча, лесапаласе на вул. Скарыны, лесапарку ў Зялёным Лузе, у раёне станцыі Сасновы Бор Дзіцячай чыгункі, у лесапарку ў раёне вул. Лосіка і вул. Семянякі, на пляжы № 2 Цнянскага вадасховішча і ў прылеглым да яго лясным масіве. Мінская лесапаркавая гаспадарка пачала праводзіць акарыцыдныя апрацоўкі названых тэрыторый. Усяго з пачатку бягучага года такія апрацоўкі правялі на адной тысячы гектараў.

Аднак, як вядома, не ўсе кляшчы заражаны небяспечнымі для чалавека інфекцыямі. Па выніках лабараторных даследаванняў кляшчоў, знятых з людзей, іх заражанасць барэліямі і вірусам клешчавога энцэфаліту склала 22,2 % і 0,5 % ад агульнай колькасці даследаваных.



## Паспець за 72 гадзіны

Улічваючы, што спрыяльны перыяд для актыўнасці іксодавых кляшчоў працягваецца, варта памятаць аб захаванні правілаў прафілактыкі пры выездзе на прыроду і на дачных участках.

Самай эфектыўнай мерай з'яўляецца прадухіленне кантакту з кляшчом — для гэтага трэба максімальна закрываць адкрытыя ўчасткі цела, выкарыстоўваць галаўныя ўборы, капюшоны, часцей аглядаць сваё адзенне і адкрытыя ўчасткі цела. Не лішнім будзе выкарыстоўваць рэпеленты і акарыцыды.

У выпадку ўкусу неабходна хутка і правільна выдаліць кляшча, апрацаваць месца ўкусу спіртазмяшчальным сродкам і звярнуцца да ўчастковага тэрапеўта (педыятра), які прызначыць неабходнае прафілактычнае лячэнне.

Калі на працягу месяца пасля ўкусу кляшча з'яўляюцца сімптомы — галаўны боль, павышэнне тэмпературы цела, з'яўленне чырвонай плямы, неабходна неадкладна звярнуцца да ўрача і абавязкова паведаміць яму аб факце прысмоктвання кляшча. «Для прафілактыкі клешчавога энцэфаліту ў нас ёсць вакцына, — кажа **ўрач-інфекцыяніст 11-й гарадской паліклінікі Андрэй МАКАРЭВІЧ.** — Імунізацыю мэтазгодна праводзіць асобам, якія выязджаюць на сезонныя работы ў высокаактыўныя прыродныя ачагі клешчавага энцэфаліту, што знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі (дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» і Бярэзінскі запаведнік), Расію (лясныя зоны Прыўралля, Сібір), іншых краін».

# Мясцовае самакіраванне

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

5 ліпеня 2023 г. № 23 (709)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# Форум магчымасцяў







**«Усе мы застаёмся пад вялікім уражаннем ад нядаўняга X юбілейнага Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі ў выдатным горадзе Уфе Рэспублікі Башкартастан. Як вы ведаеце, абноўлены абсалютныя рэкорды форуму: падпісана каля 100 пагадненняў аб супрацоўніцтве, заключана кантрактаў на суму каля 110 млрд расійскіх рублёў». Гэтыя словы Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ падчас выступлення на закрыцці дзясятай сесіі верхняй палаты парламента сёмага склікання — свайго роду вельмі ёмкае і трапнае падвядзенне вынікаў знакавага для абедзвюх краін мерапрыемства. І справа тут не толькі ў эканоміцы, у агульным супрацьстаянні санкцыям. «У рамках форуму дасягнуты дамоўленасці, якія дазваляюць істотна павысіць статус гэтай пляцоўкі ў інстытуцыйнай сістэме Саюзнай дзяржавы. Але самае галоўнае — чарговы раз мы ўсе пераканаліся ў непарушнасці брацкага саюза нашых краін. Вы бачыце, якая цікавасць да гэтага мерапрыемства ў расійскіх калег. Гэта трэба падтрымліваць і развіваць», — сказала Наталля Качанава, выступаючы перад сенатарамі на закрыцці сесіі. Можна сказаць, гэта задача для парламентарыяў на будучыню. Канкрэтныя перспектывы і мэты міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння на дзяржаўным узроўні Старшыня Савета Рэспублікі абазначыла на пленарным пасяджэнні ў рамках форуму.**




Фота БелТА.

«Неабходна ствараць уласную стратэгічную мадэль міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння, без сарамлівасці абапіраючыся на станоўчы вопыт Савецкага Саюза і замежных краін. Наш парадак дня — не рэакцыя і рэфлексія, а дасягненне нацыянальных інтарэсаў і сумесны рух наперад», — сказала Наталля Качанава.

Спікер Савета Рэспублікі прапанавала ў найбліжэйшы час пачаць фарміраванне дакумента доўгатэрміновага прагназавання і планавання міжрэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў кантэксце Саюзнай дзяржавы як адзінай трансрэгіянальнай міжінтэграцыйнай прасторы. Канкрэтныя мерапрыемствы можна вызначыць у гадавых праграмах, якія прапрацоўваюцца на панэльных дыскусіях органамі мясцовага кіравання і самакіравання і прымаюцца на пленарных пасяджэннях форуму.

«Прыярытэты сумеснай работы на найбліжэйшы час усім добра вядомыя — гэта безумоўнае выкананне рашэнняў Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы і дамоўленасцяў кіраўнікоў нашых краін. Перш за ўсё трэба засяродзіцца на паскарэнні працэсу выканання Асноўных напрамкаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады і 28 саюзных праграм», — адзначыла Наталля Качанава.

Задачы першачарговай важнасці, на яе думку, — умацаванне эканамічнага і тэхналагічнага суверэнітэту, прамысловая кааперацыя, імпартазамяшчэнне і спецыялізацыя, стварэнне новых пунктаў росту, міжрэгіянальны гандаль і развіццё транспартна-лагістычных калідораў, раскрыццё чалавечага патэнцыялу, павышэнне статусу Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі як суб'екта міжнародных адносін.

Важным механізмам паглыблення рэгіянальнай інтэграцыі Наталля Качанава назвала аналітычнае суправаджэнне рашэнняў. «Больш сістэмная і ўзгодненая работа ў гэтым напрамку дазволіць лепш даведацца адзін пра аднаго — культурны код, сучасны ўклад жыцця, хуткасць рэгіянальнага развіцця — і пазбегнуць скажонай інтэрпрэтацыі рэгіянальных і нацыянальных палітык, — сказала яна. — У цэлым, улічваючы маштаб форуму, узровень прыманых рашэнняў і іх значнасць для развіцця міжрэгіянальных сувязяў і ўсяго спектра адносін Беларусі і Расіі, мэтазгодна далейшае ўзмацненне яго сістэматызавальнай, каардынацыйнай, кантрольнай, інфармацыйна-аналітычнай функцый».

«За мінулае дзесяцігоддзе Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі заслужыў усеагульнае прызнанне і аўтарытэт неад'емнага інстытута Саюзнай дзяржавы — унікальнай мадэлі, якая прэтэндуе стаць не проста краінавым і міждзяржаўным праектам, а сапраўднай мэтай многіх пакаленняў беларусаў і расіян», — рэзюмавала Наталля Качанава.

*Аб тым, з чым прыехалі з Уфы беларускія рэгіёны, карэспандэнты «МС» распыталі, як і належыць, непасрэдна на месцах, у прадстаўнікоў абласных дэлегацый. Падрабязна аб гэтым — у сённяшнім выпуску.*

## ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Павага, увага, пашана

### Пад знакам гэтых паняццяў праходзіў святочны тыдзень у сенатараў

У дні, калі па ўсёй краіне адзначалі галоўнае дзяржаўнае свята, члены Савета Рэспублікі не заставаліся ўбаку, яны наведвалі мемарыяльныя месцы, ветэранаў. Напрыклад, член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» Алег Слінько напярэдадні Дня Незалежнасці па добрай традыцыі наведаў ветэрана вайны Фёдара Жудро.

Фёдар Рыгоравіч у свае 96 гадоў захоўвае бадзёрасць духу, у курсе ўсіх падзей, каментуе апошнія навіны, дае парады. Ветэран вайны пажадаў берагчы нашу зямлю і ніколі не забывацца на сапраўдныя падзеі вайны.

«На жаль, сёння так мала засталося тых, каму мы асабіста можам выказаць падзяку за магчымасць жыць, працаваць, ствараць, будаваць будучыню сваіх дзяцей пад мірным небам над галавой. Таму так важна цяпер падарыць ім сваю ўвагу, павагу і клопат. Нізкі паклон усім ветэранам за наша шчасце жыць, ствараць, развівацца і ісці наперад», — адзначыў парламентарый.

***

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, мастацкі кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву Беларусі народнага цырка імя Валерыя Абеля Таццяна Абель сустрэлася з творчым актывам Гомельскага дзяржаўнага цырка.

Размова ішла аб перспектывах развіцця цыркавога мастацтва Рэспублікі Беларусь, задачах, якія стаяць перад Гомельскім цыркам, аб сітуацыі ў краіне і свеце.

«Работа парламентарыя сёння закранае ўсе сферы жыццядзейнасці людзей. Кіраўнік дзяржавы, падкрэсліваючы значнасць сферы культуры ў развіцці дзяржавы і адзначаючы ўклад работнікаў культуры ў сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё краіны, 3 ліпеня, у самае галоўнае свята Рэспублікі Беларусь — Дзень Незалежнасці, сустракаецца з найлепшымі работнікамі культуры, каб уручыць ім заслужаныя ўзнагароды. Напярэдадні гэтага свята для работы парламентарыя было вельмі важна паразмаўляць непасрэдна з тымі, хто сёння стварае культурны прадукт, працуе над рэалізацыяй палітыкі культурнага імпартазамяшчэння, робіць усё магчымае, каб кожны беларус ведаў і ганарыўся традыцыямі і культурай роднай краіны. Плённы дыялог стане падмуркам для далейшай актыўнай працы», — адзначыла Таццяна Абель.

***



Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр Карпіцкі ўдастоены звання «Ганаровы грамадзянін Камянецкага раёна». Адпаведнае рашэнне прынята 29 чэрвеня 2023 года аднагалосным рашэннем дэпутатаў на нечарговай 41-й сесіі Камянецкага раённага Савета дэпутатаў XXVIII склікання.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# Форум магчымасцяў

## «ВАЖНА ВУЧЫЦЦА АДЗІН У АДНАГО, ДЗЯЛІЦЦА ВОПЫТАМ»



**У ходзе форуму падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў і Дзяржаўным сходам — Эл Курултаем Рэспублікі Алтай, Дзяржаўным Саветам Чувашскай Рэспублікі, Заканадаўчым сходам Свярдлоўскай вобласці, Ліпецкім абласным Саветам дэпутатаў, а таксама паміж Белгарадскай абласной Думай.**

Падчас X Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі адбылася сустрэча дэпутацкага корпуса Гродзеншчыны з членамі Заканадаўчага сходу — Курултая Рэспублікі Башкартастан. Гродзенцы даведаліся, як працуе мясцовы парламент. У Заканадаўчым сходзе расійскага рэгіёна 25 дэпутатаў, якія прымаюць у год каля 700 законаў, а ўсяго падчас работы сёмага склікання прынята чатыры тысячы заканадаўчых актаў.

Цікавасць беларускага боку выклікаў праект «Рэальныя справы», які рэалізоўваецца з удзелам жыхароў Башкартастана пры частковым фінансаванні з федэральнага і мясцовага бюджэтаў. Сродкі накіроўваюцца на добраўпарадкаванне двароў і дзіцячых пляцовак. Асаблівая ўвага ўдзяляецца праектам, якія датычацца сельскай мясцовасці. Дэпутаты актыўна падтрымліваюць такія ініцыятывы, іх з удзелам заканадаўцаў рэалізавана больш чым сем тысяч.

Падобны вопыт ёсць і ў Гродзенскай вобласці. Пакуль гэта работа толькі набірае абароты. **Старшыня Гродзенскага аблсавета Алена ПАСЮТА** расказала сваім расійскім калегам аб праекце «Дзейнічаем разам». Напрыклад, у мінулым годзе ў рамках праекта ў вобласці ўдалося рэалізаваць 14 ініцыятыў. Сёлета плануецца аб'явіць новы конкурс грамадзянскіх ініцыятыў з больш значным фондам. «Мы толькі на пачатку шляху, але разумеем важнасць сумесных ініцыятыў з жыхарамі, таму для нас вельмі каштоўны вопыт расійскіх партнёраў, варта вучыцца адзін у аднаго, дзяліцца напрацоўкамі», — падкрэсліла Алена Пасюта.

Трэба сказаць, што ў Гродзенскай вобласці рэалізоўваецца нямала міжрэгіянальных пагадненняў аб супрацоўніцтве. У партнёрскіх сувязях задзейнічана больш за 70 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, падпісана і дзейнічае 50 дагавораў паміж раёнамі Гродзенскай вобласці і адміністрацыямі расійскіх муніцыпалітэтаў і раёнаў. На юбілейным X Форуме працягнута практыка, скіраваная на развіццё міжрэгіянальных адносін. Паміж Гродзенскім аблвыканкамам і ўрадам Башкартастана падпісаны План мерапрыемстваў па здзяйсненні міжнародных і знешнеэканамічных сувязяў на 2024—2027 гады. Дакумент дазволіць напоўніць былыя пагадненні канкрэтнымі праектамі.

Былі замацаваны сувязі паміж малымі гарадамі двух рэгіёнаў. У верасні ў Зэльве плануецца правядзенне з'езда малых гарадоў Ніжагародскай і Гродзенскай абласцей. Падпісаны дамовы аб супрацоўніцтве паміж Гроднам і Севастопалем, Ваўкавыскім райвыканкамам і Бірскім раёнам Башкартастана.

Гродзенцы станоўча ацэньваюць вынікі работы форуму ва Уфе. Як паведамілі ў камітэце эканомікі аблвыканкама, было заключана кантрактаў на 2,5 млрд беларускіх рублёў. Гэта свайго роду фінансавы рэкорд ва ўмовах санкцыйнага ціску. Што датычыцца пунктаў узаемадзеяння, яны самыя розныя. Паколькі Гродзеншчына з'яўляецца высакаразвітым рэгіёнам у сферы АПК, маецца прапанова супрацоўнічаць у гэтым напрамку.

Напрыклад, з Рэспублікай Тыва ёсць намер узаемадзейнічаць у галіне лясной гаспадаркі. Гродзенцы гатовы падзяліцца з тывінскімі калегамі сучаснымі тэхналогіямі аднаўлення лясоў. Падымалася пытанне арганізацыі прамых паставак мяса-малочнай і лёгкай прамысловасці ў Тыву. Разглядалася і турыстычная сфера. Напрыклад, гродзенцы прапанавалі аздараўленчыя туры ў знакамітыя санаторыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота дадзена абласным Саветам дэпутатаў.**

## ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

**Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ** у складзе афіцыйнай дэлегацыі прадставіла Гомельшчыну на X Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ва Уфе.

На прасторы форуму лідар дэпутацкага корпуса паўднёва-ўсходняга беларускага рэгіёна ўдзельнічала ў сустрэчы са старшынёй Дзяржаўнага Сходу — Курултая Рэспублікі Башкартастан Канстанцінам Талкачовым.

— З 2022 года эканамічныя і гуманітарныя сувязі паміж нашымі рэгіёнамі прыкметна актывізаваліся. Адбыўся шэраг узаемных візітаў на афіцыйным узроўні, нашы прадпрыемствы і дзелавыя колы знаходзяцца ў пастаянным кантакце, расце ўзаемны тавараабарот: рост за 4 месяцы бягучага года склаў 26 %, — адзначыла старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.




Па яе словах, Гомельская вобласць заўсёды з асаблівай увагай адносіцца да візітаў дэлегацый расійскіх рэгіёнаў.

— Гэта добрая магчымасць вызначыць перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва. У першым паўгоддзі гэтага года адбылося больш за 30 абменных візітаў. Дэлегацыі ад Бранска да Уладзівастока наведалі Гомельшчыну. Прадстаўнікі дэпутацкага корпуса правялі сустрэчы з калегамі, абмяняліся досведам, вызначылі далейшае ўзаемадзеянне. У лютым гэтага года ва ўрачыстых мерапрыемствах з нагоды 85-годдзя ўтварэння Гомельскай вобласці прынялі ўдзел дэлегацыі Бранскай, Калінінградскай, Калужскай абласцей, — дадала Кацярына Зенкевіч.

Яна нагадала, што ў тым ліку старшыня Дзяржаўнага Сходу — Курултая Рэспублікі Башкартастан Канстанцін Талкачоў падчас мерапрыемстваў з нагоды 85-годдзя ўтварэння Гомельшчыны ўпершыню наведаў беларускі рэгіён. Менавіта тады была дасягнута дамоўленасць аб падпісанні Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Гомельскім абласным Саветам дэпутатаў і Дзяржаўным Сходам — Курултаем Рэспублікі Башкартастан. Лідар дэпутацкага корпуса Гомельшчыны адзначыла садзейнічанне, якое аказаў Канстанцін Талкачоў для падпісання Пратакола намераў аб супрацоўніцтве паміж Гомелем і Уфой.

Гомельскі абласны Савет дэпутатаў у рамках двухбаковых дакументаў супрацоўнічае з органамі заканадаўчай улады 12 расійскіх рэгіёнаў: Амурскай, Бранскай, Кіраўскай, Курскай, Мурманскай, Ніжагародскай, Арэнбургскай, Самарскай, Свярдлоўскай абласцей і Рэспублікай Саха (Якуція), Рэспублікай Башкартастан і Рэспубліка Тыва.

У сваю чаргу вынікам X юбілейнага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі і стала падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве з Дзяржаўным Сходам — Курултаем Рэспублікі Башкартастан і Вярхоўным Хуралам (парламентам) Рэспублікі Тыва.

— Дэпутаты, як абраннікі народа, выказваюць яго волю і жаданне — умацоўваць сяброўства з нашымі суседзямі, мірна жыць і працаваць. Парламенцкая дыпламатыя здольна забяспечыць устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё нашых рэгіёнаў і ўзмацніць інтэграцыю беларуска-расійскіх адносін. Задача дэпутатаў — максімальна садзейнічаць захаванню роўных умоў і гарантый для жыхароў і бізнесу дзвюх краін, — падзялілася Кацярына Зенкевіч сваім бачаннем, як пытанні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і пашырэння гарызонтаў садружнасці дапамагаюць вырашаць народныя абраннікі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## АД ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ДА ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

У ходзе форуму праведзена вялікая работа па наладжванні сувязяў паміж парламентамі расійскіх рэгіёнаў і Брэсцкім абласным Саветам дэпутатаў. У самым пачатку работы **старшыня Брэсцкага абласнога Савета Юрый НАРКЕВІЧ** сустрэўся са старшынёй Дзяржаўнага Сходу Рэспублікі Башкартастан Канстанцінам Талкачовым, акрэслены план далейшага супрацоўніцтва. Падпісана Пагадненне аб міжпарламенцкім узаемадзеянні паміж Брэсцкім абласным Саветам дэпутатаў і Заканадаўчым сходам Пензенскай вобласці. Таксама ў рамках форуму адбылося падпісанне плана па рэалізацыі Пагаднення паміж Брэсцкім абласным Саветам і Заканадаўчым сходам Калужскай вобласці на наступныя два гады.

— У ходзе форуму мы вывучалі розныя кірункі супрацоўніцтва — сацыяльны, культурны, эканамічны, — сказаў у размове з журналістамі **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — Асаблівую ўвагу я ўдзяляў магчымасці сумеснай работы ў галіне сельскай гаспадаркі, прамысловасці. Яшчэ мы ад пачатку ставілі мэту азнаёміцца з работай маладзёжнага патрыятычнага цэнтра ва Уфе: у іх ён функцыянуе, у нас, як вядома, ствараецца на базе мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».

Губернатар расказаў пра наведванне цэнтра «Патрыёт» Рэспублікі Башкартастан: «Разам са старшынёй гарвыканкама, маім намеснікам мы падрабязна пагутарылі з работнікамі цэнтра аб тым, якую матэрыяльную базу трэба ствараць, як наладжваць яго пастаяннае функцыянаванне. Думаю, што праз некалькі гадоў у нас будзе нешта падобнае».

Кіраўнік вобласці расказаў таксама аб перагаворах з расійскімі калегамі пра супрацоўніцтва ў мясной і малочнай галінах сельскай гаспадаркі, у сферы высокіх тэхналогій. Зроблены чарговы крок у будучай сумеснай рабоце.

Напрыклад, быў падпісаны план мерапрыемстваў на 2024—2026 гады па рэалізацыі пагадненняў аб сацыяльна-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве паміж урадам Новасібірскай вобласці і Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам. У ходзе перагавораў высветлілася, што ўзаемны інтарэс аб'ядноўвае новасібірскія прадпрыемствы і рэзідэнтаў Брэсцкага навукова-тэхналагічнага парка. Ёсць дамоўленасць пашыраць сувязі паміж суб'ектамі гаспадарання дзвюх абласцей у сельскай гаспадарцы: ад паставукі сельгастэхнікі і камбікорму да сродкаў абароны раслін.

З Пензенскай вобласцю супрацоўніцтва будзе развівацца таксама па некалькіх кірунках — эканамічным і заканатворчым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**





## ВІЦЕБСК ПРЫМЕ XI ФОРУМ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

### Прадпрыемствы паўночнага рэгіёна заключылі падчас форуму звыш 120 кантрактаў

Актыўны ўдзел у найважнейшым інтэграцыйным мерапрыемстве прыняла дэлегацыя Віцебшчыны на чале са старшынёй аблвыканкама Аляксандрам Субоцінам. На пленарным пасяджэнні кіраўнік вобласці выступіў з дакладам, прысвечаным сумеснай дзейнасці Беларусі і Расіі ў пытаннях гарантавання біялагічнай бяспекі. У завяршэнні выступлення Аляксандр Субоцін запрасіў усіх у 2024 годзе на поўнач Беларусі, у гасцінны Віцебск, з якога пачнецца адлік другога дзесяцігоддзя работы маштабнай пляцоўкі, галоўнай мэтай якой з'яўляецца садзейнічанне ўмацаванню рэгіянальнага ўзаемадзеяння дзвюх краін.



У рамках падрыхтоўкі і правядзення форуму 28 суб'ектаў гаспадарання Віцебскай вобласці падпісалі 123 камерцыйныя кантракты. Сума экспартных кантрактаў склала больш як 125 мільёнаў долараў. Таксама на форуме быў падпісаны план мерапрыемстваў на 2023—2025 гады па рэалізацыі пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Віцебскім аблвыканкамам і ўрадам Рэспублікі Башкартастан у гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і гуманітарнай сферах. Завізавана пагадненне аб узаемадзеянні ў мэтах развіцця ўнутранага і ўязнога турызму паміж упраўленнем спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама і аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыяй «Цэнтр развіцця турызму Рэспублікі Башкартастан» у рамках работы секцыі «Расійска-беларускае супрацоўніцтва па развіцці новых турыстычных напрамкаў: ад гарманізацыі заканадаўства да развіцця рэгіёнаў». Акрамя таго, у ходзе падрыхтоўкі візіту дэлегацыі Віцебшчыны ў Башкартастан праводзілася рэвізія раней дасягнутых міжрэгіянальных дамоўленасцяў і перагаворы з новымі патэнцыяльнымі партнёрамі.

Такая работа таксама дае станоўчы вынік, у тым ліку на ўзроўні раённых і гарадскіх адміністрацый. Напрыклад, аналагічны план мерапрыемстваў па супрацоўніцтве на найбліжэйшыя тры гады падпісаны ў красавіку з Кастрамской вобласцю. На стадыі ўзгаднення знаходзяцца дакументы з Рэспублікай Карэлія і Ніжагародскай вобласцю. У маі бягучага года на Міжнародным інвестыцыйным форуме ў Віцебску падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж абласным цэнтрам і Архангельскам.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін правёў сустрэчы з губернатарамі Пензенскай, Астраханскай абласцей і Стаўрапольскага краю. Бакі абмеркавалі вынікі і далягляды супрацоўніцтва. У рабоце X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі прынялі ўдзел флагманы вытворчага сектара паўночнага рэгіёна: ААТ «Нафтан», «Полацк-Шкловалакно», Аршанскі льнокамбінат, ТАА «Белвест». На фестывалі этнічных культур «Вуліца сяброўства» быў прадстаўлены павільён «Віцебскі падворак», перад гасцямі форуму выступаў вакальна-харэаграфічны ансамбль песні і танца «Талака» Віцебскай абласной філармоніі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з тэлеграм-канала «Віцебская вобласць. Афіцыйна».**

## «ТРЭБА БОЛЬШ АКТЫЎНА РАЗВІВАЦЬ МАЛАДЗЁЖНЫЯ СУВЯЗІ»

### Меркаванне старшыні Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірыны Раінчык:

— Магілёўскія дэпутаты плённа папрацавалі на X Форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі. Падпісаны Пагадненні аб супрацоўніцтве і развіцці ўзаемаадносін паміж Магілёўскім аблсаветам дэпутатаў і Думай Астраханскай вобласці, Заканадаўчым сходам Новасібірскай вобласці, а таксама планы мерапрыемстваў на 2023—2025 гады па рэалізацыі пагадненняў з Заканадаўчым сходам Калужскай вобласці і Заканадаўчай думай Хабараўскага краю. На ўзроўні райвыканкамаў устаноўлены пабрацімскія сувязі паміж Добраўскім раёнам Ліпецкай вобласці і Магілёўскім раёнам.

Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва набірае абароты, мы ўвесь час шукаем кропкі росту для дасягнення больш высокага ўзроўню якасці жыцця грамадзян. На сёння Магілёўская вобласць заключыла 27 пагадненняў з урадамі расійскіх рэгіёнаў. Дзейнічае 138 пагадненняў і дагавораў аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж гарадамі і раёнамі. Вядзецца актыўная работа па супрацоўніцтве ў сферы маладзёжнай палітыкі з прыгранічнымі рэгіёнамі Смаленскай і Бранскай абласцей, Масквой і Маскоўскай вобласцю, Ленінградскай і Калужскай абласцямі. Цесныя сувязі наладжаны з Прымор'ем і Хабараўскім краем.

Наша супрацоўніцтва паміж моладдзю ажыццяўляецца праз адукацыю, навуку, культуру, спорт, іншыя сферы. У Беларуска-Расійскім універсітэце, напрыклад, адкрыўся Цэнтр еўразійскіх даследаванняў імя Грамыкі — сумесны праект з Расійскім дзяржуніверсітэтам, адным з напрамкаў дзейнасці якога з'яўляецца правядзенне даследаванняў, прысвечаных інтэграцыйным працэсам у Саюзнай дзяржаве, ЕАЭС, СНД, ШАС. Працягваецца традыцыя студатрадаўскага і пошукавага руху, развіваецца ўзаемадзеянне ў сферы занятасці. Нашы хлопцы і дзяўчаты прынялі ўдзел ва Усерасійскай студэнцкай будоўлі «Поўнач» у Якуціі, студэнцкія атрады працуюць у Краснадарскім краі, Варонежскай вобласці, стануць удзельнікамі студэнцкага медыцынскага праекта «Атлант» у Новакузнецку.



У Магілёве на Буйніцкім полі 22 чэрвеня, у Дзень Усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, быў дадзены старт міжнароднаму патрыятычнаму праекту «Дарогамі памяці і славы». Дэлегацыя нашай вобласці, а таксама Астраханскай, Бранскай, Смаленскай, Ленінградскай абласцей і Хабараўскага краю праедуць па ўсіх раёнах Магілёўшчыны і збяруць дакументальныя гістарычныя хронікі — кнігі «Памяць», якія потым зоймуць сваё дастойнае месца ў новым музеі Воінскай Славы Магілёўшчыны.

Сёння акцэнт робіцца на больш цеснае ўзаемадзеянне паміж моладдзю дзвюх краін. Асаблівае месца ў сферы маладзёжнай палітыкі займае менавіта грамадзянска-патрыятычнае выхаванне. І мы абмяркоўвалі план работы ў дадзеным кірунку з улікам геапалітычных працэсаў, неабходнасці выпрацоўкі агульных падыходаў да дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Казалі пра неабходнасць пашыраць адзіную інфармацыйную базу, каб моладзь мела магчымасць на міжрэгіянальным узроўні знаёміцца з патэнцыялам, магчымасцямі адзін аднаго для рэалізацыі сумесных праектаў, звярнулі ўвагу на неабходнасць стварэння фонду падтрымкі рэгіянальных ініцыятыў і выдзялення на конкурснай аснове сродкаў Саюзнай дзяржавы на рэалізацыю міжрэгіянальных маладзёжных сацыяльна значных праектаў. Вельмі важная, асабліва сёння, для нашых краін тэма інфармацыйнай бяспекі. Паміж медыйнымі структурамі Беларусі і Расіі наладжана цеснае супрацоўніцтва, і гэты кірунак трэба больш актыўна развіваць і пашыраць за кошт правядзення беларуска-расійскіх прэс-тураў, анлайн-канферэнцый з удзелам маладых прадстаўнікоў журналістыкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## НАПЕРАДЗЕ — НАТХНЁНАЯ І ТВОРЧАЯ ПРАЦА

**Наталля ЯКУБІЦКАЯ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Вельмі шмат робіцца нашымі губернатарамі для ўмацавання двухбаковага супрацоўніцтва. Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын за непрацяглы тэрмін наведаў з афіцыйным візітам Ленінградскую вобласць і сустрэўся з кіраўніком Уладзімірскай вобласці. Падпісаныя пагадненні рэалізоўваюцца на практыцы ў сельскагаспадарчай сферы і гуманітарных праектах. З кожным годам наша ўзаемадзеянне ўвасабляецца ў новых фарматах. Акрамя афіцыйных пляцовак, гэта маштабныя форумы, выстаўкі, экспазіцыі. Нядаўнюю выстаўку «Белагра» наведалі губернатары Калінінградскай вобласці і Прыморскага краю. Пільную ўвагу дзелавых колаў прыцягнуў да сябе Пецярбургскі эканамічны форум. А як па-іншаму? Стрыжнявым напрамкам супрацоўніцтва ў цяперашніх умовах застаецца эканоміка як аснова дзяржавы. Адным з ключавых і перспектыўных кірункаў супрацоўніцтва з'яўляецца машынабудаванне. Візітка галіны — БелАЗы, МАЗы, трактары МТЗ, тэхніка «Амкадора».

Яшчэ адзін не менш паспяховы вектар — пастаўкі на расійскія рынкі аўтакампанентаў беларускай вытворчасці. 90 % аб'ёму экспарту гэтай прадукцыі забяспечвае прадпрыемства, якое працуе ў Мінскай і Гродзенскай абласцях ААТ «БАТЭ Кіруючая кампанія холдынгу «Аўтакампаненты». У ролі спажыўцоў выступаюць аўтазборачныя прадпрыемствы «КАМАЗ», «Група ГАЗ», «УРАЛ», «Пецярбургскі трактарны завод», кампанія «Растсельмаш».

На парадку дня — тэма імпартазамяшчэння. У Саюзнай дзяржаве створаны ўсе ўмовы для паспяховай работы ў гэтым кірунку. Рэалізаваны буйнамаштабны імпартазамяшчальны праект па вытворчасці амінакіслот. Гэта распрацоўка беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі (БНБК). У маі на базе карпарацыі адбыўся біятэхналагічны форум, які прыцягнуў увагу 100 суб'ектаў гаспадарання з расійскіх рэгіёнаў. Мы гатовыя пашыраць супрацоўніцтва ў гэтым кірунку.

Лічу неабходным адзначыць ролю маіх калег парламентарыяў ва ўмацаванні і развіцці двухбаковых сувязяў паміж нашымі дзяржавамі. Намаганнямі народных выбраннікаў узводзіцца трывалы падмурак для пленнага супрацоўніцтва і дружбы паміж нашымі народамі. Кожны год павялічваюцца актывы міжпарламенцкіх пагадненняў. Яскравым прыкладам такога цеснага ўзаемадзеяння з'яўляецца супрацоўніцтва з Рэспублікай Татарстан. Дэлегацыя Мінскага абласнога Савета дэпутатаў пабывала па запрашэнні старшыні Дзяржаўнага Савета Татарстана Фарыда Хайрулавіча Мухаметшына ў Казані. Падчас візіту абмяркоўваліся перспектывы агульнай працы, у прыватнасці прасоўванне тавараў беларускіх вытворцаў (Беллегпрама) на рынак Татарстана і ўзаемадзеянне паміж суб'ектамі малога і сярэдняга бізнесу ў аграрнай сферы.

У маі па ініцыятыве старшыні Мурманскай абласной Думы Сяргея Дубавога адбылася сустрэча з яго намеснікам Генадзем Сцяпахнам у Мінскім абласным Савеце дэпутатаў з прадстаўнікамі Маладзёжнага парламента. Гэта сведчыць аб высокім узроўні даверу да моладзі і яе ўдзеле ва ўсіх працэсах, якія адбываюцца ў краіне. Па ініцыятыве дзяцей запланаваны тэлемост на патрыятычную тэматыку. У найбліжэйшы час мы яго правядзём.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ГЕРМАНАВІЧЫ ГУЧАЛІ І БУДУЦЬ ГУЧАЦЬ

**Жыхары адсвяткавалі юбілей свайго аграгарадка, што на працягу 460 гадоў узвышаецца на маляўнічых берагах ракі Дзісны.**



Фота kilich.by

Сімвалічна, што юбілейную дату прымеркавалі да Дня вызвалення мястэчка ад фашысцкіх захопнікаў (1 ліпеня 1944 года). Мерапрыемствы пачалося мітынгам каля помніка-зеніткі, усталяванага ў гонар воінаў 1406 зенітна-артылерыйскага палка. Затым было ўрачыстае шэсце ў нацыянальных касцюмах са снапкамі збажыны і валошкамі — удзельнікі свята ішлі калонай да галоўнай пляцоўкі, дзе праходзяць усе знакавыя мерапрыемствы ў Германавічах. Па дарозе спыніліся і ўсклалі кветкі каля помніка воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ушанавалі іх хвілінай маўчання. Дарэчы, раней на помніку быў агульны надпіс, а летась з'явілася шыльда, дзе пералічаны ўсе землякі, якія загінулі ў ваенных падзеях, пайменна, каб кожнае імя засталося ў памяці нашчадкаў назаўжды.

Які ж юбілей без цёплых слоў і падарункаў?! І іх у той дзень было багата. У прыватнасці, некалькі жыхароў Германавічаў былі адзначаны ганаровымі граматамі раённага Савета дэпутатаў і райвыканкама. Сярод узнагароджаных — старшыня Германавіцкага сельскага Савета Мая Якімовіч.

— Германавічам сёлета спаўняецца 460, а самай старэйшай жыхарцы Тамары Адамаўне Рабізе 27 снежня будзе сто гадоў. Паедзем віншаваць яе са святам дадому, павязём падарункі, — распавядае Мая Якімовіч. — Адзначылі таксама Іосіфа Адольфавіча і Аляксандру Сцяпанаўну Хаданёнкаў, якія сёлета святкуюць залатое вяселле, самую шматдзетную сям'ю, у якой выхоўваецца пяцёра дзяцей, самых маленькіх жыхароў аграгарадка — Ілью Бучынскага і Цімафея Катовіча і іх бацькоў. Выклікалі на сцэну кіраўнікоў прадпрыемстваў, якія шчыруюць у аграгарадку. Дзякавалі ім за актыўны ўдзел у розных мерапрыемствах, што падтрымліваюць парадак на сваіх тэрыторыях, шмат робяць для росквіту Германавічаў. Акрамя таго, адзначылі школьнікаў, якія скончылі навучальны год на выдатна. Адна з іх, Ульяна Сташкевіч, выпускніца 11 класа, стала студэнткай медуніверсітэта. Спадзяёмся, што яна адвучыцца і вернецца на сваю малую радзіму, як гэта калісьці зрабіў Вадзім Радкевіч, які працуе цяпер у мясцовай гаспадарцы інжынерам і якому мы таксама ўручылі падарунак.

Падчас святкавання юбілею падвялі вынікі конкурсу на найлепшы падворак. «Іх шмат — узорных, цяжка было вызначаць найлепшы з найлепшых, бо наогул дэвіз нашага аграгарадка — утульнасць, прыгажосць і парадак. На гэты раз адзначылася сям'я Навіцкіх». Пасля ўрачыстай часткі быў святочны канцэрт. Шчыра, кранальна, ад душы віншавалі рознымі нумарамі жыхароў аграгарадка мясцовыя таленты, а таксама госці з Шаркаўшчынскай дзіцячай школы мастацтваў».

— Многія адзначалі, што ўсё прайшло, як звычайна, вельмі душэўна, цёпла, па-дамашняму. Ганаруся, што так склаўся лёс, і я цяпер працую ў гэтым знакавым месцы, — гаворыць старшыня сельсавета. — Заўсёды кажу, што Германавічы гучалі, гучаць і будуць гучаць у гісторыі нашай краіны. Тут вельмі шмат цікавага. Толькі касцёл Перамянення Пана XVIII стагоддзя чаго варты, а таксама былы палац Шырынаў, у якім сёння знаходзіцца музей мастацтва і этнаграфіі імя Язэпа Драздовіча. Дарэчы, у тым палацы раней ладзіліся сапраўдныя балі. У нас ёсць мара адрадзіць гэтую прыгожую традыцыю. Візіткай аграгарадка з'яўляецца і Дом ганчара, дзе працуюць лаўрэаты міжнародных конкурсаў Сяргей Рымдзёнак і яго жонка Ганна. Асабіста для мяне Германавічы — сімвал духоўнасці, культуры. Пагадзіцеся, далёка не ў кожным мястэчку ёсць столькі храмаў (акрамя касцёла, тут дзейнічае Свята-Мікалаеўская ды стараверская цэрквы). Нехта заўважыў, што ў нас у Германавічах пастаянна нейкі рух: то талакой наводзім парадак на валах, то едзем у велапрабег. Не паспее адно свята скончыцца — ужо трэба рыхтавацца да іншага. У прыватнасці, традыцыйны «Бульбяны фэст» запланавалі сёлета на пачатак жніўня. Толькі б бульба ўрадзіла, а калоды, на якіх смажыць дранікі, знойдзем. Запрашаем, прыязджайце абавязкова!

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**

*Шаркаўшчынскі раён.*

# ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА ВЯСКОВАЯ ГРАМАДА?

## Старасты-пераможцы спаборніцтва – пра добрыя справы на карысць населеных пунктаў

**Нядаўна на Брэстчыне ўзнагародзілі пераможцаў конкурсу сярод сельскіх, гарадскіх Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання вобласці па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Адзначылі таксама найлепшых старастаў. Карэспандэнт МС пагутарыла са старастамі вёсак, якія занялі прызавыя месцы ў спаборніцтве. Дзве з іх працуюць у вялікіх населеных пунктах, адна — у сярэднім. Кожная з жанчын, паводле меркавання кіраўнікоў мясцовай улады, карыстаецца павагай і аўтарытэтам у асяродку аднавяскоўцаў, шмат робіць для паляпшэння свайго населенага пункта.**

**Любоў ГУГНЮК, староста вёскі Клепачы Пружанскага раёна:**

— Мой канёк у рабоце — гэта добраўпарадкаванне і ўпрыгажэнне кветкамі вуліц, двароў, агульных тэрыторый, якіх у нашым аграгарадку даволі многа. Некалі, у сярэдзіне 1970-х, у Клепачах вырас цэлы пасёлак як цэнтральная сядзіба былога саўгаса «Савецкі». За паўстагоддзя населены пункт прырос новымі вуліцамі, атрымаў развіццё. Цэнтральная плошча аграгарадка з Домам культуры, адміністрацыйным будынкам гаспадаркі, гандлёвым цэнтрам уяўляе сабой закончаны архітэктурны ансамбль. Застаецца падтрымліваць усё ў належным стане, клапаціцца пра эстэтыку дваровых тэрыторый, вуліц.

Пачынаючы з вясны мы пасадзілі шмат кветак, добраўпарадкавалі шэраг клумбаў. Адно засмучае: ва ўсім названым знайсці падтрымку ўдаецца пераважна ў людзей майго ўзросту. Маладыя жыхары не вельмі ахвотна падключаюцца да прыборкі тэрыторый, агульных суботнікаў. У вольны час яны аддаюць перавагу гаджэтам, а на вуліцы, як вядома, віртуальныя кветкі не вырастуць.

**Таццяна БРЫШТЭН, староста вёскі Павіцце Кобрынскага раёна:**

— Старастай мяне абралі амаль тры гады таму. І першай маёй справай у гэтай якасці была агітацыйная работа сярод аднавяскоўцаў, каб давесці да ладу агароджу могілак. Рэч у тым, што могілкі даўно закрытыя, але ж яны знаходзяцца фактычна ў вёсцы, што вымагае адпаведнага догляду аб'екта. Жыллёва-камунальная гаспадарка, на чыім балансе могілкі, некалькі гадоў таму абнесла агароджай палову іх. Камунальнікі зрабілі столькі, колькі было вылучана грошай. А мы ўсёй грамадой вырашылі давесці справу да канца, зрабіць другую палову агароджы. Каб сабраць грошы, давялося пахадзіць па хатах, пагутарыць з людзьмі, пабываць і ў працоўных калектывах. Але патрэбную суму сабралі, і агароджу паставілі.

Потым узяліся за дзіцячую пляцоўку. Асноўныя сродкі на набыццё абсталявання выдзеліліспонсары, работу па ўзвядзенні пляцоўкі арганізоўваў сельвыканкам. Але ж, як заўсёды, каб давесці да поўнага парадку любую справу, патрабуюцца дробязі. Ну, напрыклад, каля пляцоўкі трэба, каб была лаўка пасядзець дарослым, абавязкова патрэбная сметніца, побач някепска пасадзіць клумбу. Вось гэта мы абмеркавалі з актывістамі і рушылі па хатах збіраць грошы. А калі сабралі і зрабілі ўсё як след, самім прыемна стала. І цяпер у нашай дзіцячай пляцоўкі адпачываюць сем'і з дзецьмі. Летам яна асабліва запатрабаваная.

Потым былі яшчэ сквер у цэнтральнай частцы вёскі, рэканструкцыя брацкіх пахаванняў на могілках, дзе патрабаваліся не толькі сродкі, але і актыўны ўдзел добраахвотнікаў. Бо паднесці, прыбраць, пафарбаваць — частка любой работы па добраўпарадкаванні. І на гэта трэба арганізоўваць людзей.

З апошніх нашых агульных спраў — уладкаванне новага крыжа, аднаго з пяці, дарэчы, якія ўстаноўлены ў Павіцці. Гэты зусім састарэў, мы вырашылі яго замяніць. Сабралі грошы, купілі матэрыял. Са зваркай і ўстаноўкай дапамагло сельгаспрадпрыемства, цяпер крыж устаноўлены.

**Галіна САНЮТА, староста вёскі Вартыцк Іванаўскага раёна:**

— Першай нашай значнай справай пасля майго абрання старастай было навядзенне парадку на могілках. Памятаю, знеслі за сезон 127 дрэў, прыбралі лішнюю расліннасць, усё вычышчалі, фарбавалі. На суботнікі выходзіла да сарака чалавек у дзень, усяго ў Вартыцку пражывае крыху больш за 180 жыхароў. Тады я зразумела, наколькі нашы людзі чулыя, свядомыя, іх можна арганізаваць на любую добрую справу.

За гады работы ў мяне сфарміраваўся касцяк актывістаў-памочнікаў, каля дзясятка чалавек, якія заўсёды прыйдуць на дапамогу, арганізуюць суседзяў. Так было, калі мы, напрыклад, добраўпарадкавалі капліцу. Гэта агульная справа вясковай грамады, якой вёска можа ганарыцца. Насельніцтва старэе, не раз даводзілася чуць ад сталых жыхароў, што добра было б сваю капліцу мець — да царквы ў Опаль дабірацца восем кіламетраў. І тут, насупраць вось гэтага сквера, стаў пуставаць дыхтоўны дом. Гаспадары памерлі, дзеці-вяскоўцы маюць свае дамы. Можна сказаць, дзеці і прапанавалі пераабсталяваць дом пад капліцу, што мы і зрабілі. Цяпер два разы на месяц да нас прыязджае святар, асабліва рады гэтаму пажылыя людзі.



**Кожны вольны куток зямлі ў Клепачах засаджваецца кветкамі.**

Агульным клопатам стала падтрыманне парадку вакол помніка аднавяскоўцам, якія загінулі ад рук фашыстаў. Вартыцк у 1942-м спалілі карнікі, загінула тады 82 жыхары, згарэла больш за сто дамоў. Вёска адрадзілася. Сваім святым абавязкам лічым даглядаць памятны знак. Робім гэта разам са школьнікамі. Расказваем дзецям па трагічныя падзеі, нагадваем пра жахі вайны. Гэтай вясной таксама прывялі ў парадак тэрыторыю, пасадзілі кветкі. Жыве памяць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.723. Нумар падпісаны ў 19.30 4 ліпеня 2023 года.

## РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «КОФЕ CARTE NOIRE НА IPHONE»

Завершилась Рекламная игра «Кофе Carte Noire на iPhone», участие в которой могли принять достигшие возраста 18 лет физические лица, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, которые выполнили условия п. 10 правил Рекламной игры.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором и (или) заинтересованными лицами, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**Для участия в Рекламной игре было необходимо:**

• Иметь зарегистрированную Карту «Заправка», либо приобрести данную Карту «Заправка» и заполнить анкету участника Программы «Заправка» (далее – анкета) в сроки, указанные в Таблице № 2 правил Рекламной игры, указав при этом свои достоверные данные, а именно: фамилию, собственное имя, отчество (если таковое имеется), дату рождения, номер мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, населенный пункт, а также адрес электронной почты.

• Предоставить согласие на обработку персональных данных и участие в Рекламной игре путем проставления отметки в личном кабинете на сайте azs.belorusneft.by.

• Совершить покупку Игрового продукта, согласно перечню, указанному в п. 8 правил Рекламной игры, в период с 17 апреля 2023 г. (00.00.00) по 11 июня 2023 г. (23.59.59) включительно с использованием Карты «Заправка».

По результатам проведения Рекламной игры 16 призов нашли своих обладателей:

Приз 1 (Мобильный телефон Apple iPhone 14 128GB цвет Starlight/ цвет Midnight / цвет Blue и денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз) – 16 шт.

**Список победителей:**

Кулешова Марина Александровна – Приз 1 цвет Starlight
Савич Сергей Васильевич – Приз 1 цвет Starlight
Юркевич Екатерина Владимировна – Приз 1 цвет Starlight
Стулинский Павел Анатольевич – Приз 1 цвет Starlight
Кутько Герман Геннадьевич – Приз 1 цвет Starlight
Тушинский Виктор Андреевич – Приз 1 цвет Starlight
Купчик Константин Николаевич – Приз 1 цвет Midnight
Семенков Павел Сергеевич – Приз 1 цвет Midnight
Андреев Анатолий Владимирович – Приз 1 цвет Midnight
Карпов Павел Андреевич – Приз 1 цвет Midnight
Чашинский Илья Владимирович – Приз 1 цвет Midnight
Асташевич Александр Витальевич – Приз 1 цвет Midnight
Сцепуро Виталий Игоревич – Приз 1 цвет Blue
Ятусевич Александр Михайлович – Приз 1 цвет Blue
Рыжиков Игорь Борисович – Приз 1 цвет Blue
Смирнов Руслан Леонидович – Приз 1 цвет Blue

**Организатор Рекламной игры:** Общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192452588 (далее – организатор).

Местонахождения Организатора: 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 21, корп. 5, оф. пом. 152, этаж 1.

**Наименование Рекламной игры:** «Кофе Carte Noire на iPhone»

**Срок начала рекламной игры:** 17 апреля 2023 г.

**Срок окончания рекламной игры:** 6 июля 2023 г.

**Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры:** с 17 апреля 2022 г. по 11 июня 2023 г.

Рекламная игра зарегистрирована 4 апреля 2023 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 4298.

Общее количество участников: 782 234 человека.

Призовой фонд был разыгран полностью.

Полный список победителей рекламной игры размещен на сайте: azs.belorusneft.by.

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры: +375 (44) 707-02-69.

## Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»

сообщает об отмене первых повторных электронных торгов № 2023.Б.002.00055 по продаже имущества ОАО «Минский завод строительных материалов», находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве), назначенных на ЭТП ETPVIT.BY 07.07.2023, опубликованных 21.06.2023 в газете «Звязда», на сайте bankrot.gov.by 22.06.2023, на сайте Минского облисполкома https://minsk-region.gov.by/dlya_delovykh_lyudey/auktsiony.

Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63. УНП 390477566.

## Извещение о проведении повторного открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638 |
| **Продавец** | ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70. УНП 100770618. Тел. +375 29 6139869 |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование | Нач. цена (с НДС), дол. США | Шаг аукциона*, дол. США |
|---|---|---|---|
| | Месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12 | | |
| 1 | **Ограждение бетонное** (инв. номер 980773). | **1242,97** | 62,15 |
| | Месторасположение: г. Минск, пр-т Пушкина, 70 | | |
| 2 | **Домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромех. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. № 30121) | **1872,71** | 93,64 |
| 3 | **Аппарат гидроабразив. резки** (инв. № 70103) | **15 274,59** | 763,73 |
| 4 | **Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124** (инв. № 70124) | **10 806,57** | 540,33 |
| 5 | **Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4** (инв. № 41028) | **7815,62** | 390,78 |
| 6 | **Робот промыш. KUKA KR 150 со шкафом управления и соединит. кабелями** | **14 875,74** | 743,79 |
| 7 | **Профильный проектор Helios 350H** | **5175,02** | 258,75 |
| 8 | **Незавершенное пр-во стана поперечно-клиновой прокатки SP-5000-2** | **450 312,10** | 22 515,61 |
| 9 | **Снегоотбрасыватель ST268EP** | **1220,79** | 61,04 |
| 10 | **Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25MoCr4: d 101.6 мм х 8809 мм – 2436 кг** | **3401,60** | 170,08 |
| 11 | **Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25MoCr4: d 110,0 мм х 8790 мм – 2 318,49 кг** | **3252,98** | 162,65 |
| 12 | **Стальные катанные прутки марки 25 MoCr4, 102,00 мм – 1 900,00 кг** | **1851,98** | 92,60 |

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводится за счет покупателя

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни по предварительному согласованию по тел. +375 (29) 6139869, Дмитрий

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица».
С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **ipmtorgi.by**

**Задаток 1 %,** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона:** не позднее **7 (семи) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размерах, указанных в информации об аукционе на сайте www.ipmtorgi.by, от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.06.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время начала аукциона: 18.07.23 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б**. Заявки** на участие **принимаются по 17.07.2023 до 17.00** по тому же адресу

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## Извещение о проведении повторных публичных электронных торгов (аукциона)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |
| **Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)** | Извещение о проведении публичных электронных торгов опубликовано 05.05.2023 в газете «Звязда» № 85 (29965), стр. 15 |

**Повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| **1** | **Клуб, корпус № 23, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102** (изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-88907 (назначение – помещение культурно-просветительного и (или) зрелищного назначения, наименование – клуб, составные части и принадлежности – неотапливаемая пристройка, площадка асфальтобетонная, фекальная канализация, хозяйственный водопровод, кабельная линия, теплотрасса, ограждение, 81/100 доля помещений общего пользования – помещение 10 – коридор 12, 0 кв. м, помещение 22 – коридор 81,9 кв. м, помещение 31 – электрощитовая 11,6 кв. м, помещение 32 – коридор 3,6 кв. м) общей площадью 919,2 кв. м) | 447 930,00 | 298 620,00 |

Информация о имуществе, входящем в состав лота № 1, прилагается в виде Приложения № 1 к протоколу комитета кредиторов ОАО «Беларусьрезинотехника» от 16.06.2023 № 91 на сайте https://iintorgi.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа: **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by. Состав имущества и подробная информация о нем размешена на интернет-сайте https://bankrot.gov.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета торгов электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов.
Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by, www.iin.by**.

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит до 500 тыс. белорусских рублей, 1 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит свыше 500 тыс. белорусских рублей в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 20.07.2023 начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| Дата и время окончания приема заявок | заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 19.07.2023 г. до 16.00 |
| **Контактные данные** | **тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ.

***Место проведения***: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 66-114. ***Форма проведения:*** открытый конкурс. ***Предмет торгов:*** право на заключение договора купли-продажи объекта торгов (далее – ДКП). ***Наименование объекта торгов:*** квартира с инв. № 500/D-255915, г. Минск, ул. Пугачевская, 9-50. ***Сведения об объекте:*** общ. площадь: 40,7. ***Дата и время проведения торгов:*** 17.07.2023 в 10.00. **Начальная цена** (сумма в белорусских рублях эквивалентная): 60 000 долл. США по курсу НБ РБ на день проведения торгов. ***Задаток:*** 1500,00 бел. руб. ***Организационный сбор:*** 3100,00 бел. руб. ***Срок заключения договора купли-продажи:*** 30 рабочих дней с момента утверждения протокола. ***Расчеты за объект:*** в день заключения ДКП. ***Передача объекта:*** в течение 15 календарных дней с момента заключения ДКП. ***Срок снятия с рег. учета***: до заключения договора купли-продажи. ***Окончание приема заявок***: 14.07.2023 в 17.00. Расходы по государственной регистрации ДКП и основанных на нем прав оплачиваются: заказчиком и Победителем (единственным участником) в равных долях. ***Иные условия проведения объявленных торгов***: Срок возможного отказа от проведения торгов до момента окончания приема заявок. Право подачи и подписания заявления о государственной регистрации ДКП и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с Порядком организации и проведения торгов, утвержденным приказом директора ООО «ЦентрСитиБай» от 06.04.2018г № 2. К участию в торгах допускаются лица, внесшие задаток и подавшие заявку на участие в торгах, а также представившие организатору заверенную банком копию платежного поручения или соответствующую квитанцию о перечислении задатка. Организационный сбор уплачивается Победителем (единственным участником торгов) в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола. Сумма задатка учитывается при окончательном расчете между Победителем (единственным участником торгов) и Организатором. Задаток перечисляется на р/с: BY35MTBK30120001093300089651, ЗАО МТБанк, код MTBKBY22, г. Минск, ул. Толстого, д. 10, УНП 193056974. **Организатор: общество с ограниченной ответственностью «ЦентрСитиБай»,** УНП 193056974, **тел. +375 (17) 231-73-93, e-mail: info@centrcity.by, www.centrcity.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Бобруйская оптовая база», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 185-5 |

**Предмет аукциона**

**Капитальное строение:** холодильник с камерами хранения (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) с инвентарным номером 710/С-56649, общая пл. 2908 кв. м.
Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 187Б.
*Составные части и принадлежности:* с крыльцом.
*Земельный участок* общ. пл. 1,1715 га предоставлен продавцу для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения (участок № 1) на праве постоянного пользования.
*В состав лота № 1* входит иное имущество: компрессор BITZER Ecoline 4NES-14Y-40P, система охранно-пожарной сигнализации (Гоголя, 187Б), система видеонаблюдения (внутри склада) Гоголя, 187Б, система видеонаблюдения (наружная) Гоголя, 187Б, ворота секционные подъемные «Pro Trend» 1800/3200 ADS703PE, ворота секционные подъемные «Pro Trend» 2600/2550 ADS703PB, рампа с навесом (инв. номер 01.1, заводской номер 513), газопровод (газоснабжение изолированного помещения, склад-холодильник г. Бобруйск, ул. Гоголя, 187Б)

**Начальная цена без НДС – 1 310 519 бел. рублей.**
**Шаг аукциона – 65 525,95 бел. рублей**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Ответственное лицо: Артем Петрович, тел. +375 29-111-47-27

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** (тридцать) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: 30** (тридцать) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов и вознаграждение 2 % от цены продажи лота возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **07.08.2023** в 13.00 по адресу**: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **04.08.2023** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# ГАЛОЎНАЕ — ГЭТА СЁННЯ,

## бо заўтра ў ім нічога не зменіш

**Дзесяць сотак зямлі — для сада-гарода, для нейкага хлеўчука, дома, цяпліцы, а з часам, магчыма, лазні — гэта ж так, здавалася, мала...**

**Каб выйграць месца, усе гаспадарчыя пабудовы «загналі» ў так званы цокаль: дом на лецішчы атрымаўся высокім, далёкім ад зямлі, што, вядома ж, дрэнна.**

**Што, магчыма, добра — вокны ў ім выходзяць на... шпакоўні і тым самым дыктуюць клопат: чакаць, пакуль птушкі вернуцца з выраю, назіраць, як старанна яны будуюцца, як гадуюць дзяцей...**

**Але ж самае цікавае пачынаецца потым, калі малыя ў чаканні ежы «разносяць» шпакоўню, калі адтуль высоўваюць галоўкі, каб паглядзець, што робіцца звонку, калі хочуць і так баяцца ўзляцець!**

**Першым тады хоць трохі лягчэй, бо ззаду іх «падштурхоўваюць» іншыя. У апошняга «штурхачоў» няма — хіба мара таксама лунаць, не адстаць ад іншых.**

**У птушак — як у людзей.**

### Нітка да ніткі — беднаму кашуля...

Горад, крамка, даўгаватая чарга, што зусім не здзіўляе, бо пах адсюль, здаецца, на вярсту... Ды і выпечка, кажуць, на славу!

— Нам, калі ласка, восем піражных, — замаўляем на кампанію. І потым акуратна вязём — да сяброў, на другі канец горада.

А ўжо там, дастаўшы з пакунка, бачым, што піражных зусім не восем, а сем...

Стары анекдот: свой першы мільён крамшчыца Лена зарабіла фразай: «Дзесяць рублёў буду вам вінаватая».

### Хто папярэджаны...

«Мабілкі» наўкол і «пяюць» — на ўсе галасы! З самых незвычайных — у крамах, у вагонах метро — кукарэканне, плач немаўляці, нашы «Рэчанька», «Тры чарапахі» ды бадзёрае: «А я ў печы не паліла, мілы мой, міленькі, а я есці не варыла, голуб мой сівенькі...»

Некаму, напэўна, жонканазвоньвала: папярэджвала, што вячэры няма.

Ці нагадвала, каб у краму зайшоў.

### Другое багацце

...На грузінскім тэлебачанні — аналаг праграмы «Што? Дзе? Калі?», прамая трансляцыя. Пытанне тэлегледача з Тбілісі: «У якім творы Пушкіна ёсць слова «кровать»? Знатакі выкручваюць мазгі, думаюць. Праходзіць хвіліна — адказу няма. Тады — слова гледачу, і ўжо ён пераможна «спявае»: *«Анэгін, я с кровать не встану, безумно я люблю Татьяну!»*

Гэта, вядома ж, анекдот. Зараз — чыстая праўда.

Таня была рэдкай дзяўчынай — ну хоць бы тым, што ніколі не карысталася касметыкай, не хавала пад доўгімі спадніцамі ды нагавіцамі свае, мякка кажучы, непрыгожыя ногі. Казала, абы хадзілі — на заняткі, на дыскатэку... У танцах ёй, здаецца, роўных не было!

А таму не дзіва, што побач круціліся... жаніхі, што адзін — высокі, прыгожы, нават з кватэрай — паклікаў замуж. І Таня пайшла.

«Ну-у, гэта ненадоўга!», «Не пара...», «Ён зараз жа разгледзіцца — кіне», — казалі яе аднагрупніцы. А Таня — жыла. Уставала першай, збірала сняданкі і, адпраўляючы мужа на работу, амаль заўсёды казала: «Я тут новы рэцэпт знайшла... На вячэру ў нас будзе такое...»

Адгадайце зараз, куды пасля работы спяшаўся муж?

Ну, вядома ж, туды, дзе чакалі! Спачатку Таня адна... Потым — з маленькай дачушкай. З дзвюма...

Здароўе, кажуць, першае наша багацце, другое — шчаслівае сужэнства, якое трымаецца на чымсьці... нябачным звонку.

### Не пра танк?

Кумачкі ў трамваі — ну, як дома на кухні! Нуль увагі на «публіку»: сядзяць, «шчабечуць» і, здаецца, пра ўсё...

Тут і зараз — самае цікавае:

— Слухай, а твой муж быў на юбілей да цябе прыходзіў? — пытаецца адна.

— А як жа!.. І падарункі прынёс! — хваліцца другая. — Аддае (нават цешчы!) ды кажа: «Я толькі на хвілінку...» Мы яму — разам: «Ды хоць на ўсю ноч!» А што — госць жа лаўкі не праседзіць. Стол накрыты... Мяне ж, ты ведаеш, хлебам не кармі, дай нешта згатаваць, а тым больш для гасцей! Сем салатаў зрабіла, тры гарачыя, пірагоў з дачкой напяклі... Пасядзелі, пагаварылі, заспявалі... Дзеці ж на музыку ходзяць... Такі канцэрт нам зладзілі!.. Былы мой, бачу, сядзіць — ну як кот у красках! Шапчу: «Мо табе дадому пара?» Ён — аж здрыгануўся: мусіць, забыўся, што дом не тут?.. З суседам на лесвіцу пакурыць хадзіў, яму і прабалбатаўся, што новая жонка і прыгожая, і разумная, і на 15 гадоў маладзейшая, а каб нешта дома зрабіць, дык яе няма: усё сам...

— Твой?! Сам? — не верыць вушам слухачка. — І як жа ён так уляпаўся?

— Як-як?... А то не ведаеш: мужчына ж — нібы танк: куды дула, туды і вежа.

І назад дарогі няма.

### Хацела як лепей...

Каханне ў лёсе — як пажар у лесе: зоймецца немаведама з чаго, немаведама калі і тады...

Ксеня была замужам, гадавала дачку, будавала кватэру, мела добрую работу, пажылых бацькоў... А потым як звар'яцела: забрала дзіця і ходу — у іншы горад, іншае жыццё.

...Той, другі яе муж, быў нашмат старэйшы і куды багацейшы. З ім яна магла не працаваць: «весці дом», гадаваць дзяцей (ён марыў, што іх будзе трое, як мінімум). Ёй жа — на новым месцы — карцела пачаць спачатку, з нуля, некаму нешта даказаць, дабіцца самастойнасці, незалежнасці, уласных грошай, кар'еры...

І жанчына яе рабіла: хай пакрысе ды расла па службе.

І дачка яе таксама расла.

І ў мужа — як потым дазналася — маленькі сын ад іншай жанчыны, а таму восьгэтай — двойчы разведзенай — прыдаліся і яе незалежнасць, і кар'ера, і грошы.

...На іх — ну вядома ж — яна магла наняць рэпетытара, падцягнуць дачку па матэматыцы, але ў класе быў «батанік», які згадзіўся рабіць гэта бясплатна: спачатку — дома ў Ксені, потым — дома ў сябе, адкуль дачка заўсёды вярталася нейкай маўклівай, чужой. І толькі потым, пад «допытам»,



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

расказала, чаму. Таму, што там, у «батаніка», — дом і сапраўдная сям'я, дзе ёсць тата і мама, якая не марозіць супы і катлеты на тыдзень, таму што там — сёстры і браты, сумесныя размовы і сумесная праца, там яе любяць і разумеюць... «А хіба я не люблю?!» — не верачы вушам, спытала маці. «Ты — найболей сябе!» — выпаліла дачка.

...«Батанік» (акулярык, маленькі, худзенькі) і сапраўды падцягнуў дзяўчынку па матэматыцы: яны разам паступілі вучыцца.

Ксеня жыве адна.

Каханне ў лёсе — як пажар у лесе.

### Дзве сястры

Міхайлаўна ці не адзіная з досыць шырокага кола знаёмцаў, хто можа пачаставаць паляндвічкай, салам, кумпячком, прычым не проста тоненька парэзаць на талерку, а кавалачак дастаць са скрыні, прынесці ў хату, каб... загарнуць з сабой.

Баронімся, як толькі можам: кажам, што ўсё гэта ёсць у продажы, што спатрэбіцца ёй самой, што госці мы так сабе, бо ёсць жа бліжэйшыя...

— Гэта вы пра сястру? — удакладняе жанчына. — Дык яна ж мне родная і няродная. У нас з ёй маці адна, а бацька... Мой — светлай памяці — дабрэнны быў. Зімой усё кармушкі для птушак рабіў, вясной — шпакоўні... А Марынін — сам сабе есці шкадаваў (што ўжо казаць пра іншых...). Сястра па ім пайшла. У горад пасля школы з'ехала, на работу ўладкавалася. А як выхадныя — дык адразу ў вёску, дамоў. Прыедзе — два дні ад'ядаецца, бо ў горадзе, кажа, дорага і нясмачна. І спіць яшчэ, бо там шумна... Мама шкадавала яе, малодшую, пазнюю: не будзіла, усе грошы свае аддавала, сумкі складвала... Ну і я туды ж... Не паверыце: калі б мы апошняе з сябе пазднімалі, яна, далібог, узяла б — не спытала б, у чым застанемся?!. Вось такі чалавек: па крыві, — дык, здаецца, няма раднейшага, па душы — чужая чужаніца. Але як ёсць, так ёсць.

І нічога ўжо не зменіш.

### Гэта быў не рубель

...Некалі даўно, каб спраўдзіць мару (купіць чырвоны гальштук і стаць піянеркай) бабуля збірала бутэлькі. Яе ўнучка, не маючы грошай на планшэт, пайшла з гітарай у парк.

Вярнуўшыся, расказала, як хвалявалася, як баялася, як няёмка і страшна было заспяваць, але яна «сабрала ўсю волю ў кулак»: змагла!..

І потым, здаецца, нідзе не збілітала словы, стрымала мелодыю: іграла і спявала!

Людзі, праходзячы міма (а хтонікто спыняўся!), слухалі яе, асобныя нават плацілі — дробнай манетай. Але ж нейкі дзядзечка, што спачатку міма прайшоў, потым вярнуўся і паклаў ёй цэлы рубель.

— Вось ён, — паказвала дзяўчынка, — мой першы зароблены! І я — ніколі-ніколі, ні на што не патрачу яго, — захаваю на ўсё жыццё!

...Дзядзечка, які тым самым рублём аддзячыў за песню, мусіць, гэтак жа «ніколі-ніколі» не дазнаецца, што падарыў чалавеку нешта большае, чым рубель.

### Каб сказаць... І пачулі

У пад'ездзе (і нават доме, дзе пад'ездаў з дзесяць) гэта ведаюць многія: калі трэба пазычыць грошай — схадзі да Жоры: ён мае, прычым заўсёды. Адкуль?

Мужчыны меркавалі, што яму дапамагаюць родныя, жанчыны — што яны ж, бацькі, прывучылі эканоміць...

Ды памыляліся і адны, і другія, бо, калі спыталі, Жора прыгадаў зусім не сям'ю, а бабулю-вахцёрку.

Банальная зусім гісторыя.

Жора — пасля службы ў войску — прыйшоў на завод, атрымаў ложка-месца ў рабочым інтэрнаце, неяк дацягнуў да першай зарплаты. Яе — хлопцы сказалі — трэба «абмыць». Ды ён і сам гэта ведаў: пасля работы зайшоў у краму, купіў гарэлкі з віном, закускі... Сумку нёс — як падняць!

На ўваходзе ў інтэрнат яго вахцёрка спыніла, сказала:

— Сынок, ты, бачу, тут новенькі? Малады... Табе жыць і жыць яшчэ. Хочаш, каб нейкая капейка за душою была, каб потым — добрая жонка, сям'я?..

— А хто ж не хоча? — паспрабаваў адмахнуцца хлапец.

— Тады паслухай, што я табе скажу: ніколі не выпівай з палучкі.

— Гэта чаму?

— А ты вось зараз трохі ўстрымайся, вочы не залівай — паглядзі на сваіх суседзяў.

...У той вечар (і якраз жа ў пятніцу) яны — Жора бачыў — накацілі будзь здароў: той «паддачы», што ён прынёс, аказалася мала, двойчы пасылалі «ганцоў» па дабаўку і пасля яе ледзьве распаўзліся!

Назаўтра, у суботу, сабраліся зноў — проста пахмяліцца, узяць па чарцы, аднак спыніцца, на жаль, не змаглі. У нядзелю ўсё пачалося спачатку.

Панядзелак атрымаўся цяжкім — многім на рабоце балелі галовы, многія аддавалі старыя даўгі, а недзе праз тыдзень залазілі ў новыя, бо не было на абеды.

«Я вось гэтак жыць не хачу», — цвёрда вырашыў Жора і, чарговы раз атрымаўшы грошы, стаў казаць сваім хлопцам, што яму трэба з'ездзіць у вёску да бацькоў (да брата, да пляменніка на дзень нараджэння, на спатканне...)

Сярод дзяўчат і досыць хутка знайшлася любімая — згулялі вяселле, стварылі сям'ю.

Яна і сапраўды ў іх харошая: двое дзяцей, кватэра, машына... Усё так, як казала бабуля-вахцёрка. І, напэўна ж, не толькі яму, Жору, — многім жыльцам!

Шкада, што нямногія слухалі.

### Парада

Калі сэрца насіць асцярожна, жыць можна.

Кропка восьтут, у канцы маналога, была не заўсёды: зрэдку прасіўся клічнік! А найчасцей — пытальнік, бо — маладая ж яшчэ — хацелася пакатацца на роварах, дагнаць аўтобус, падурэць з дзецьмі, «адарвацца» ў танцы і — само сабою — у працы, але...

Не раз і не два яе ратавала хуткая, аж пакуль не «з'явіўся» ўласны доктар з... апавядання Льва Талстога. Як толькі адчуеце, што ёсць сэрца, — казаў ён свайму пацыенту, — канчайце, кідайце заняткі, забаўляйцеся. Горш за ўсё — хваляванні. Ні ў якім разе не дапускайце сябе да гэтага.

...Праверана: калі не дапускаць — жыць і сапраўды можна.

**Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж.***

Нехта не дурны прызнаў, што наша жыццё — гэта тры дні: учора, сёння і заўтра. Учора ўжо прайшло — і мы ў ім нічога не зменім, заўтра яшчэ не наступіла, значыць, сэнсу няма пра яго непакоіцца.

А таму галоўнае, што ёсць у кожнага (ва ўсякім разе пакуль...) — гэта сёння. З большым ці меншым поспехам яго можна ствараць, можна пражываць, святкуючы маленькія радасці.

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Надзеі Дрындрожык з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.**

# АД ПЛОШЧЫ БАНГАЛОР ДА СВІСЛАЧЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як вядома, метро — самы эканамічны, хуткасны і экалагічна чысты від транспарту, найбольш аптымальны для вялікіх гарадоў. Мінская падземка сёння на працягу сутак перавозіць каля 800 тысяч пасажыраў, што складае трэць агульнагарадскіх пасажырскіх перавозак. З адкрыццём новых станцый метро гэтая лічба нашмат павялічыцца. І натуральна, што ў жыхароў і гасцей сталіцы паўстае пытанне: «А калі?»



## Наведваемся на плошчу Бангалор

Работы стартавалі ў першым квартале гэтага года з арганізацыі будгарадка на вуліцы Багдановіча непадалёк ад плошчы Бангалор і перакладкі інжынерных сетак. Цяпер з боку жылых дамоў на адным участку ідзе вынас кабельных і оптавалаконных ліній. На другім участку прыступілі да ўладкавання часовай цеплатрасы. На трэцім жа ўчастку за два гады павінны цалкам вынесці з-пад участка забудовы ўсе сеткі, знесці адселены жылы дом і «Прыёрбанк». Акрамя таго, на працягу падрыхтоўчага перыяду трэба будзе падрыхтаваць аб'язныя шляхі для транспарту, усталяваць агароджы і перадаць аб'ект у такім выглядзе для будаўніцтва самога метро.



Зацверджаны схемы аб'язных шляхоў. Вядома, што самыя істотныя змены ў арганізацыі руху закрануць плошчу Бангалор. Нагадаем, на новым участку Зеленалужскай лініі трэба будзе пабудаваць чатыры станцыі падземкі: «Прафсаюзную», «Пярэспу», «Камароўскую» і «Парк Дружбы народаў».

Работы непасрэдна па пракладцы метро стартуюць з плошчы Бангалор, непадалёк ад якой будзе наладжаны катлаван для тунэлепраходчага комплексу «Алеся». Адсюль тэхніка рушыць у бок ужо існуючай станцыі трэцяй лініі «Юбілейная плошча».

## Што робіцца пад Свіслаччу?

Будаўніцтва трэцяй лініі метро працягваецца. Хай, можа, і не такімі тэмпамі, як было заяўлена першапачаткова, але пад зямлёй вядуцца работы. І часам з проста складаных яны ператвараюцца ў архіскладаныя. Задачу з зорачкай трэба будзе ў хуткім часе вырашыць метрабудаўцам: будучыя станцыі «Пярэспа» і «Прафсаюзная» падзяляе рака Свіслач. І яе трэба неяк «спакаваць». Выхад ужо знойдзены. Нам растлумачылі, што плануецца зрабіць.

— Праходцы пад ракой будзе папярэднічаць комплекс мерапрыемстваў па перапуску Свіслачы. Спачатку на ўчастку ракі зробяць водапаніжэнне, затым шпунтавай агароджай рэчышча падзеляць напалам: па адной частцы Свіслач працягне сваю плынь, на другой будзе ўмацаваны адхон і пачнецца ўстаноўка жалезабетоннай пліты таўшчынёй 500 мм. Калі пліта набярэ трываласць, водны струмень будзе накіраваны на гатовую палову, а на другой пачнецца бетанаванне. Плошча прыгрузу (маналітнай падушкі) — больш за 600 квадратных метраў, ад узроўню вады яна адступіць дзесьці на паўтара метра — такім чынам будзе забяспечана абарона перагонных тунэляў ад паступлення вады і прасядання грунту. Адлегласць ад дна ракі да верху шалыгі (верхняй кропкі перагоннага тунэля) складзе каля пяці метраў — па нашых разліках, гэтага цалкам дастаткова, — сцвярджае **галоўны інжынер праектаў «Мінскметрапраекта» Павел НЕПАЧАЛОВІЧ**, выкарыстоўваючы спецыяльную лексіку. Што ж, відовішча будзе, як мінімум, цікавым. Будзем сачыць за гэтым пунктам іназіраць змены на галоўнай гарадской рацэ.

## Прайшліся па новых станцыях

Зноў спускаемся пад зямлю і глядзім, што адбываецца на «зялёнай» лініі метро: з першымі чатырма станцыямі ўсё зразумела, а вось наступны адрэзак усё яшчэ схаваны ад вачэй старонніх. І пакуль мы не можам закінуць жэтончыкі ў турнікеты, прайсціся па платформах і сесці ў цягнікі. Але, дзякуючы нашым спадарожнікам, мы ўсё ж такі зазірнулі. «Мінскбуд» распавёў, што адбываецца на станцыі, запуску якой вельмі чакаюць жыхары комплексу «Мінск-Свет».

— Самую высокую ступень гатоўнасці мае «Аэрадромная». Там вядуцца аддзелачныя работы, манціруюць абсталяванне, на платформе ўсталёўваюцца кранштэйны для будучых інфармацыйных блокаў і асвятлення, — расказвае **начальнік дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Павел ЦАРУН.**

Менавіта «Аэрадромная» мае самую высокую ступень гатоўнасці ў параўнанні з астатнімі. Амаль усе работы набліжаюцца да фінальнай стадыі. Адкрыцця «Аэрадромнай» не варта чакаць раней чым у наступным годзе, але зазірнуць пад зямлю можна ўжо цяпер. Вядома, віртуальна: на экскурсію, на жаль, не запішашся.

— Платформа «Аэрадромнай» даволі прасторная. Такога эфекту ўдалося дасягнуць дзякуючы адсутнасці калон. Пасажыры змогуць спусціцца да саставаў на ліфце і па лесвіцы, а на платформу — на чатырох эскалатарах (па два на спуск і на ўздым). Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі будзе працаваць спецыяльны пад'ёмнік, — патлумачыў **намеснік начальніка ўчастка № 4 тунэльнага атрада «Мінскметрабуда» Яўген РАГІНСКІ.** — Дарэчы, пры ўзвядзенні «Аэрадромнай» заклалі перасадачны вузел, які будзе звязваць трэцюю і чацвёртую, кальцавую, лініі сталічнага метрапалітэна. Гэта стандартная практыка для метрапалітэна ва ўсім свеце. Пасля завяршэння асноўных работ пачнецца афармленне «Аэрадромнай». Вядома, яе ўнутранае ўбранне будзе цесна звязана з назвай і месцам, дзе яна знаходзіцца, — побач з былым аэрапортам. Думаю, ва ўсіх пасажыраў тут будуць узнікаць асацыяцыі з небам і палётамі. Асабіста мне яна ўжо нагадвае ангар. Плануецца, што на платформе ўсталююць макет самалёта. Калі казаць пра колеры інтэр'ера, то ў ім пераважаюць сіні, блакітны, шэры і белы.

Ужо завершана абліцоўванне гранітам двух вестыбюляў станцыі «Аэрадромная». Платформавая частка ў граніце працэнтаў на 80. На стадыі аддзелачных работ пакрыццё з натуральнага каменю, якое абаронена ад пашкоджанняў адмысловымі шчытамі, таму колер і фактуру падлогі мы пакуль не ўбачым, а вось са сцен дзе-нідзе ўжо можна прыгледзецца. Тынкоўшчыкі распачалі аздабленне сцен станцыі, следам за імі зойдуць маляры. Прыкладна пасярэдзіне станцыі, пад платформай, метрабудаўнікі пакінулі прастору, якая будзе раскансерваваная з пачаткам будаўніцтва чацвёртай лініі мінскай падземкі, бо дзве лініі звяжа пешаходны пераход.

На станцыі «Немаршанскі сад» ужо прыступілі да аздаблення. Канструкцыі станцыі глыбінёй 16 метраў цалкам пабудаваны. Цяпер там працуюць над другім уваходам і вентыляцыйным каналам. Спецыялісты паступова прыступаюць да аддзелкі.

Завяршаюцца маналітныя работы станцыйнага комплексу «Слуцкі гасцінец». Мантажныя работы трох новых станцый плануюць завяршыць у 2024 годзе, як і электрадэпо «Слуцкае». Станцыю метро «Слуцкі гасцінец» пачалі ўзводзіць пазней за іншыя, таму працэнт гатоўнасці аб'екта значна меншы. Тут працягваецца будаўніцтва платформеннага ўчастка і вестыбюля, пазней пачнуць будаўніцтва ўваходаў.



Каб новыя станцыі былі максімальна камфортныя як для пасажыраў, так і для супрацоўнікаў метрапалітэна, ужо на стадыі ўзвядзення ўкараняюцца перадавыя тэхналогіі. Напрыклад, рэйкі, выкладзеныя па бясшпальнай тэхналогіі, дазволяць значна скараціць узровень шуму. Таксама ствараюцца ўмовы для руху беспілотных цягнікоў і не толькі. Ёсць зрухі і па станцыях бліжэй да цэнтра.

— Ужо падпісаны дагавор з генпадрадчыкам на будаўніцтва чатырох будучых станцый — «Плошча Бангалор», «Камароўская», «Пярэспа» і «Прафсаюзная», — паведаміў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Аляксандр ЧЭРНІКАЎ.**

Цяпер рыхтуюцца да мантажу і запуску шчытавога комплексу, з яго дапамогай закрытым спосабам будуць пракладваць тунэлі ў цэнтральную частку горада.

## Як аб'ехаць?

Як вядома, не ўсе работы па будаўніцтве метро вядуцца пад зямлёй. Для гасцей і жыхароў сталіцы важна ведаць, як аб'ехаць перакрытыя ўчасткі. Нам распавялі пра актуальныя змены аўтамабільнага руху.

«Схема руху транспарту ў працэсе будаўніцтва станцыі «Прафсаюзная» будзе мяняцца. Заезд у напрамку вуліцы Заслаўскай будзе арганізаваны з праспекта Машэрава, выезд на праспект Пераможцаў — мінаючы Дом прафсаюзаў (праспект Пераможцаў, 21)», — паведамілі ў вытворчым аб'яднанні «Мінскбуд».

Там жа ўдакладнілі, што на перыяд аднаўлення на вуліцы Мельнікайтэ і будаўніцтва ўваходаў у метро скразнога праезду не будзе. Але прадугледжаны пад'езд да сацаб'ектаў, адміністрацыйных будынкаў і жылых дамоў.

Ад вуліцы Мельнікайтэ ў напрамку плошчы Бангалор будзе радыкальна мяняцца схема аўтамабільнага руху. Аб'езд у раёне Бангалор запраектаваны бліжэй да парку: па тры паласы ў абодва бакі. Пры будаўніцтве станцыі «Камароўская» транспартны паток будзе пушчаны ў абыход: па вуліцы Кульман — Крапоткіна — Веры Харужай. «Пярэспу» плануецца аб'язджаць з двух бакоў. Такім чынам, не прыйдзецца «намотваць» дадатковыя кіламетры.

«Мінскбуд» праінфармаваў, што распрацоўка інжынернай падрыхтоўкі трэцяга ўчастка зялёнай ліні метро цалкам завершана і ўжо атрымана станоўчае заключэнне экспертызы.

Вядома, што чатыры станцыі, размешчаныя на адрэзку больш за 4 кіламетры, будуць узводзіцца адкрытым спосабам. Праца карпатлівая, паколькі гэта цэнтр горада, і прыйдзецца пераносіць сеткі. Толькі на ўчастку ад вуліцы Кульман да Някрасава праходзяць тры калектары дыяметрам ад 500 да 1500 мм і дзясяткі іншых камунікацый... Але дзеля зручнасці паездак у блізкай перспектыве можна нейкі час і пацярпець.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, сайт в интернете: www.cpo.by |
| Продавец | ОАО «Агат – электромеханический завод», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронного аукциона**
**Оборудование, бывшее в употреблении, по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115 (территория предприятия)**

| Лот № | Наименование | Год выпуска | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Станок токарно-винторезный 1Д63А | 1958 | 42301111 | 1571,60 |
| 2 | Станок ЭС-4000 | 1997 | 42316012 | 7329,60 |
| 3 | Обрабатывающий центр ЕС-4000 | 1986 | 42314012 | 11 370,24 |
| 4 | Электропечь СЭВ 3,3/11.5 МО | 1971 | 42412043 | 4063,68 |
| 5 | Печь СЭВ-5,5/11,5 Н2 | 1988 | 42412058 | 13 756,68 |
| 6 | Настольно-сверлильный станок 2Н106П | 1974 | 42306179 | 825,60 |
| 7 | Пресс кривошипный К-23186 | 1978 | 42101063 | 1449,60 |
| 8 | Пресс К2324 | 1974 | 42101048 | 2649,60 |
| 9 | Станция телефонная автоматическая СИС 4000-04 | 2008 | 45602064 | 1663,20 |
| 10 | Универсально-фрезерный станок FNK 25 | 1985 | 42308249 | 4929,60 |
| 11 | Пресс гидравлический для пластмасс П-457Г | 1960 | 42102041 | 5649,60 |
| 12 | Радиально-сверлильный станок 255 | 1953 | 42306068 | 1245,60 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа **ЗАО «Центр промышленной оценки»** УНП 191 021 390.

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона.** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену.

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 до 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **08.08.2023 г.** с 10.00 по 11.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **07.08.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
